

ВЯСЁЛЫЯ ГІСТОРЫІ ЧЫТАЧОЎ **5**

АД ЧЫСТАЙ ЗЯМЛІ ДА ЧЫСТАЙ ПЛАНЕТЫ МС




Выдаецца з 9 чэрвеня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

5 чэрвеня 2020 г.
ПЯТНІЦА
№ 108 (29222)



9-24 стар. МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ +TV ПРАГРАМА


З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

# «Для нас вельмі важна цяпер, каб да ўлады прыйшлі патрыёты і прафесіяналы»

## Кадравы чацвер у Палацы Незалежнасці — новыя людзі ў Саўміне і Адміністрацыі Прэзідэнта



Фота БелТА.

**У сераду вечарам Аляксандр Лукашэнка прыняў рашэнне аб адстаўцы дзеючага складу ўрада. Яно не стала нечаканым. За мінулыя амаль два тыдні кіраўнік краіны ўжо неаднойчы заяўляў, што прадставіць новы склад Саўміна. Учора лідар дзяржавы агучыў новыя імёны членаў урада.**

### ЧАС НЕ ТОЙ, КАБ НЕШТА ЛАМАЦЬ

«Хто занадта перанапружаны, прашу расслабіцца і зразумець: нічога надзвычайнага няма. Звычайная, я сказаў бы, традыцыйная сітуацыя, хоць і досыць важная», — ахарактарызаваў падзею кіраўнік дзяржавы. Ён зноў падкрэсліў: змена ўрада напярэдадні прэзідэнцкіх выбараў — не навацыя.

Да таго ж, працэс ратацыі кадраў у кіраўніцтве краінай пачаўся даўно: год працуе новы міністр аховы здароўя, змяніліся некаторыя іншыя міністры і віцэ-прэм'ер.

Ён запэўніў, што ніхто з членаў урада, хто працаваў да адстаўкі, не застанецца без работы. І прывёў у прыклад Сяргея Румаса, з якім меў размову. «Вялікіх прэтэнзій у мяне да яго няма, але чалавек хоча займацца бізнесам. Ён мне сказаў: хачу зарабіць грошы, немалыя грошы, я магу іх зарабіць, — перадаў сутнасць гутаркі Прэзідэнт. — Калі ў яго ёсць, дзе гэты мільён зарабіць, я буду гэта толькі вітаць. Не думаю, што Румас з'едзе з краіны і павязе гэтыя грошы, ён іх укладзе тут у эканоміку. Але ўсё павінна быць сумленна і па законе».

Тут няма ніякай канспіралогіі, запэўніў кіраўнік дзяржавы.


СТАР. 2


## КОРАТКА

- **Амаль 23 тысячы маладых людзей плануюць працаўладкаваць органы па працы, занятасці і сацабароне летам.**
- У Беларусі плануецца павялічыць тэрміны ўстанаўлення інваліднасці: з двух да трох гадоў для першай групы і з аднаго года да двух гадоў для другой і трэцяй.
- **«Гомсельмаш» сумесна з брытанскай кампаніяй Perkins працуюць над інавацыйным камбайнам.**
- Амаль палова ДТЗ з удзелам веласіпедыстаў адбываецца па іх віне.
- **У Полацку знайшлі плінфы XII стагоддзя з выявай музыканта-блазна.**



- У Гродне зноў змянілі тэрміны адключэння гарачай вады: планавыя работы на сетках пачнуцца ў ліпені.



На ўваходзе пацыентам вымяраюць тэмпературу.

На свае вочы

# «ДЗЯКУЙ ЗА ВАШУ ПРАЦУ! ВЫ — ГЕРОІ НА ЎСЕ ЧАСЫ!»

## ЯК ПРАЦУЮЦЬ З COVID-ПАЦЫЕНТАМІ ДЗІЦЯЧЫЯ ЎРАЧЫ

**Работа дзіцячых паліклінік, гэтак жа як і дарослых, змянілася з-за распаўсюджвання каранавіруснай інфекцыі. Бескантактавае вымярэнне тэмпературы на ўваходзе, раздзяленне патокаў наведвальнікаў, выязныя брыгады для лячэння COVID-хворых дома — усё гэта яшчэ нейкі час будзе нашай рэальнасцю. Як лечаць дзяцей з каранавірусам (якія, дарэчы, пераносяць гэту інфекцыю нашмат лягчэй, чым дарослыя), чаму некаторым сем'ям даводзіцца наведваць з міліцыяй і як удаецца пераканаць падлеткаў выконваць правілы самаізаляцыі, мы даведаліся, завітаўшы ў 3-ю гарадскую клінічную дзіцячую паліклініку Мінска.**


СТАР. 4


Надвор'е

# ЛЕТА. САПРАЎДНАЕ!

## На наступным тыдні прыпячэ да плюс 30 градусаў

**Надышло лета — і ўсё змянілася. У шматкіламетровай тоўшчы атмасферы змяняецца накіраванасць паветраных патокаў з паўночных на паўднёва-заходнія, а гэта прывядзе да пацяплення, паведамляюць спецыялісты Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.**

А вось у суботу цёплая вільготная паветраная маса распаўсюдзіцца на ўсю тэрыторыю краіны. На большай частцы Беларусі пройдуць кароткачасовыя дажджы, месцамі прагрымяць навальніцы. Вецер прагназуецца паўднёвы, паўднёва-заходні ўмераны, пры навальніцах парывісты. Тэмпература паветра ўначы складзе ад плюс 11 да плюс 16 градусаў. Удзень будзе па-летняму цёпла: ад плюс 19 да плюс 25 градусаў, па паўднёвым усходзе — да 27 цяпла.

Актыўнае чэрвеньскае сонца будзе саграваць нас і далей. У нядзелю захаваецца ўплыў цёплай і вільготнай паветранай масы. Удзень па паўднёвым захадзе краіны надвор'е будзе вызначаць атмасферны фронт. Воблачна з праясненнямі. Удзень месцамі, а па Гродзенскай і Брэсцкай абласцях на большай частцы тэрыторыі пройдуць кароткачасовыя дажджы, у асобных раёнах прагрымяць навальніцы. Вецер прагназуецца паўднёвы ўмераны, пры навальніцах парывісты. Тэмпература паветра ўначы складзе ад плюс 11 да плюс 17 градусаў. Удзень будзе 21—27 цяпла, па паўднёвым усходзе — да плюс 29 градусаў.

Паводле папярэдніх прагнозаў айчынных сіноптыкаў, на наступным тыдні будзе пераважаць цёплае летняе надвор'е з кароткімі навальнічнымі дажджамі. Тэмпературны фон у начныя гадзіны складзе ад плюс 12 да плюс 18 градусаў. Удзень у сярэдзіне тыдня будзе 21—28 цяпла, па паўднёвым усходзе — нават да плюс 30 градусаў. Лета. Сапраўднае.

**Сяргей КУРКАЧ.**


ISSN 1990 - 763X
20108



ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

Ідзе падпіска на «Звязду» на III квартал і II паўгоддзе

Мы абяцаем нясумнае лета з любімай газетай

ЗАСТАВАЙЦЕСЯ З НАМІ — БУДЗЕ ЦІКАВА!

# «Для нас вельмі важна цяпер, каб да ўлады прыйшлі патрыёты і прафесіяналы»

*(Заканчэнне.*
*Пачатак на 1-й стар.)*

«Час не той, каб нешта ламаць, — дадаў Прэзідэнт. — Нават не час будаваць. ***Сёння трэба выратаваць тое, што пабудавалі».*** Паводле слоў Аляксандра Лукашэнкі, у цяперашняй няпростай сітуацыі нават такія дзяржавы, як ЗША і Расія, не раскідваюцца фінансавымі сродкамі. ***«Выратаваць краіну і выйсці з гэтага становішча мы можам толькі дзякуючы сваёй дысцыпліне, сціснуўшы зубы, дзякуючы стрыманасці і скіраванасці ўсяго народа на рашэнне праблем»,*** — рэзюмаваў Прэзідэнт.

## «НЯМА ЭКСПАРТУ — НЯМА ВАЛЮТЫ»

На думку кіраўніка краіны, зараз мала не дапусціць падзення ўзроўню жыцця людзей. «Неабходна ўмець працаваць у складаных умовах і бачыць шляхі развіцця там, дзе іх не бачаць іншыя», — упэўнены Прэзідэнт Беларусі.

«За гэты час удалося захаваць збалансаванасць у эканоміцы па большасці паказчыкаў. Сумесна з Нацыянальным банкам забяспечана ўстойлівасць на фінансавым рынку, выраслі даходы насельніцтва, рэалізаваны шэраг значных інвестыцыйных і інфраструктурных праектаў», — падвёў вынікі двухгадовай работы папярэдняга Саўміна Прэзідэнт.

Сярод праектаў будучага ён назваў БНБК, атамную электрастанцыю, касмічныя ініцыятывы. Урад — ключавы орган, эканамічны штаб і цэнтр прыняцця найважнейшых рашэнняў. Неабходна знайсці формы, што прымусяць усю сістэму дзяржаўных органаў забяспечваць выкананне галоўнай мэты — дасягнення ўстойлівага і збалансаванага эканамічнага росту тэмпамі вышэй за сярэднесусветныя.

«Яшчэ адзін найважнейшы кірунак нашай дзейнасці — экспарт. Няма экспарту — няма валюты. ***Прычым праблему залежнасці ад рынку адной краіны павінны вырашыць канчаткова. Мы не можам нават ад братэрскай Расіі залежаць на 50—55 працэнтаў. Мы павінны дыверсіфікаваць рынкі»,*** — адзначыў кіраўнік краіны.

На яго думку, неабходна заняцца рэгіянальнай палітыкай, каб падцягнуць да ўзроўню буйных гарадоў раёны, што адстаюць па якасці жыцця. І задача гэта не толькі мясцовых улад, але і ўрада.

Саўміну неабходна прыняць прынцыповае рашэнне па абароне ўнутранага рынку. Яшчэ адна зона адказнасці ўрада — эканамічны складнік суверэнітэту. ***«Усе рашэнні, якія ўплываюць на лёс Беларусі, павінны прымацца толькі ўнутры краіны і намі»,*** — заключыў Аляксандр Лукашэнка.



Фота БелТА.

## ЗАДАЧЫ ПАСТАЎЛЕНЫ. ЧАС ПРАЦАВАЦЬ

Прэм'ер-міністрам прызначаны Раман Галоўчанка. Да гэтага ён узначальваў Дзяржкамваенпрам Беларусі.

Прэзідэнт растлумачыў, чаму менавіта Раман Галоўчанка будзе кіраваць Саўмінам. «Ён аб'ехаў увесь свет паслом, на шчасце, і шмат моў вывучыў, ведае, як весці перагаворы. Са мной удзельнічаў у шматлікіх перамовах і працаваў на самым складаным напрамку — арабскім, дзе мы ўвогуле ніякіх пазіцый не мелі, а сёння яны нашы найлепшыя сябры», — заўважыў беларускі лідар.

Па яго словах, асноўная зона адказнасці Рамана Галоўчанкі цяпер — эканоміка. Прэзідэнт адзначыў, што рэалізаваны значныя рэформы ў сельскай гаспадарцы — «зроблена не ўсё, але краіна ведае, у якім кірунку рухацца».

«У прамысловасці мы таксама ведаем, што рабіць, але канкурэнцыя шалёная па нашых таварах», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка, падкрэсліўшы, што Раман Галоўчанка на папярэдняй рабоце займаўся прамысловасцю на самым высокім тэхналагічным узроўні. «Я хачу ад яго атрымаць больш высокі тэхналагічны ўзровень у прамысловасці. Ва ўсіх сферах, дзе гэта магчыма. Ён нядрэнны арганізатар», — сказаў беларускі лідар.

Але, самае галоўнае, на думку Лукашэнкі, што Раман Галоўчанка — «надзейны чалавек, якому можна давяраць. Ён патрыёт сваёй краіны, нарадзіўся і вырас у Беларусі. Аб'ездзіўшы ўвесь свет, не застаўся нідзе. Для нас вельмі важна цяпер, каб да ўлады прыйшлі патрыёты і прафесіяналы».

* * *

Старшынёй Камітэта дзяржаўнага кантролю прызначаны Іван Церцель.

Да цяперашняга часу Іван Церцель працаваў на пасадзе намесніка старшыні КДБ. «Не таму, што генерал, хоць я вельмі гэта цаню, — сказаў Прэзідэнт пра прызначэнне Івана Церцеля старшынёй Камітэта дзяржкантролю. — Генерал — гэта дысцыпліна. Церцель займаўся ў Камітэце дзяржбяспекі кантролем у эканоміцы. І, як яго характарызуюць яго супрацоўнікі, ды і я шмат чуў: гэта адданы краіне чалавек. У якога няма ніякіх кланаў. Ён ведае абстаноўку ў краіне, перш за ўсё ў эканоміцы, і здольны перавесці на новыя рэйкі работу Камітэта дзяржкантролю не адмяняючы таго, што было зроблена пры папярэднім кіраўніцтве, у тым ліку Леанідам Анфімавым».

Пры гэтым Анфімаў, як чалавек «надзейны і моцны», без работы не застанецца, дадаў Прэзідэнт.

* * *

Першым віцэ-прэм'ерам стаў Мікалай Снапкоў. Кіраўнік дзяржавы растлумачыў, што прыняў рашэнне вярнуць яго з пасады пасла ў КНР, бо той мае вялікі вопыт работы ва ўрадзе, што вельмі важна, калі Савет Міністраў абнаўляецца.

* * *

Аляксандр Субоцін будзе працаваць намеснікам прэм'ер-міністра Беларусі. Па словах Прэзідэнта, Субоцін адукаваны чалавек, доктар навук. «Але самае галоўнае — ён папрацаваў у Расіі, інтэграцыйных структурах (быў членам Калегіі (міністрам) па прамысловасці і аграпрамысловым комплексе Еўразійскай эканамічнай камісіі. — **«Зв.»**). Ён добра ведае не толькі Расію, але ўнутраныя працэсы, паддывановыя гульні ў гэтых інтэграцыйных структурах. І ўлічваючы, што віцэ-прэм'еры перш за ўсё будуць адказваць за экспарт, а галоўны наш партнёр — Расія, я думаю, і тыя кантакты, якія ў яго ёсць, і тыя знаёмствы спатрэбяцца», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

* * *

Першага намесніка прэм'ер-міністра Дзмітрыя Крутога Прэзідэнт прызначыў у сваю Адміністрацыю намеснікам кіраўніка.

«Дзмітрый Крутой накіраваны на службу ў Адміністрацыю для набыцця вопыту не толькі спецыяліста ў эканоміцы. Хай паглядзіць на работу ўрада збоку, таму што яго функцыя перш за ўсё — быць фільтрам у эканоміцы. На ўзровень Прэзідэнта не павінна выйсці ніводнага непрафесійнага рашэння», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

* * *

Дзмітрый Крутой прыйшоў на пасаду замест Валерыя Бельскага, які стаў памочнікам Прэзідэнта. Яго задача — займацца пытаннямі кантролю за банкаўскай сістэмай.

«Так, шмат чаму прыйдзецца вучыцца. Той прабел, які я бачу ў рабоце Прэзідэнта. У мяне ніколі не было памочніка, які займаўся б гэтымі пытаннямі. А функцыі, паўнамоцтвы Прэзідэнта заключаюцца ў каардынацыі і кантролі за дзейнасцю галін улады, таму і Прэзідэнт павінен мець ключавых фігур на гэтых кірунках», — упэўнены беларускі лідар.

Такія дарадцы ў яго павінны быць на ўсіх кірунках: у парламенце, судовай уладзе, эканоміцы. Асаблівыя спадзяванні ў Аляксандра Лукашэнкі на Валерыя Бельскага таксама і з-за навуковага досведу.

* * *

Руслан Пархамовіч прызначаны на пасаду міністра архітэктуры і будаўніцтва. Яго Прэзідэнт назваў кіраўніком будучага.

«Вельмі жвавы, малайчына. Кеміць у будаўнічай галіне», — дадаў Лукашэнка і сказаў, што былога кіраўніка ведамства Дзмітрыя Мікулёнка папрасіў да сябе старшыня Мінгарвыканкама Анатоль Сівак.

Міністрам жыллёва-камунальнай гаспадаркі прызначаны Андрэй Хмель. Аляксандр Лукашэнка расказаў, што рыхтуецца нарада па арганізацыі работы ў сферы ЖКГ. «У ЖКГ павінен прыйсці гаспадар. Старшыня райвыканкама, старшыня гарвыканкама, кіраўнік адміністрацыі ў горадзе — яны павінны быць гаспадарамі», — сказаў Прэзідэнт.

* * *

Аляксандр Лукашэнка звярнуўся да прызначанага міністрам інфармацыі Ігара Луцкага, які да ўчарашняга дня кіраваў тэлеканалам СТБ: «Ведаю, СТБ стала іншым, малайчына. Ты навучыўся эфектыўна працаваць у інтэрнэце... Думаю, што нам прыйдзецца з тваёй падачы перш за ўсё пераарматаваць работу Міністэрства інфармацыі».

* * *

«Краіну трэба замацаваць. І калі вы спрацуеце з Раманам Галоўчанкам па прамысловасці, лічыце, што мы як мінімум праскочылі гэту пандэмію і гэты крызіс, народжаны ёю. Ты можаш. Але БелАЗ ад цябе нікуды не сыходзіць пакуль», — звярнуўся да новага міністра прамысловасці Пятра Пархомчыка Прэзідэнт.

У найбліжэйшыя дні ўрад павінен вызначыцца, чым можна дапамагчы беларускаму машынабудаванню. «Трэба падтрымаць беларускія заводы. Там вялізная колькасць людзей», — адзначыў беларускі лідар.

* * *

«Глядзі кожную капейку!» Такі наказ прагучаў на адрас новага міністра фінансаў Юрыя Селіверстава. Максім Ермаловіч папрасіўся на дыпламатычную работу, растлумачыў адстаўку былога міністра Прэзідэнт.

Дзмітрыя Пантуса на пасаду старшыні Дзяржкамваенпрама прапанаваў Раман Галоўчанка, ухваліў гэта прызначэнне і дзяржсакратар Савета бяспекі.

Прэзідэнт дадаў, што тэрміны, на якія астатнія члены ўрада захавалі свае пасады, залежаць ад іх саміх.

***«Мы сёння здаём экзамен. Не толькі я. І не столькі я — вы. Сканцэнтруемся ўсе, здадзім гэты экзамен — захаваем краіну. І будзем ганарыцца тым, што час выбраў нас...»*** — рэзюмаваў кіраўнік дзяржавы.

# «МЫ НЕ ДАЗВОЛІМ ПАДЗЯЛІЦЬ БЕЛАРУСЬ»

**Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка, прымаючы кадравыя рашэнні па новым складзе ўрада, закрануў і тэму перадвыбарчай кампаніі.**

Беларускі лідар падзяліўся, якія пытанні ў яго ўзнікаюць, калі ён бачыць некаторыя заявы прэтэндэнтаў у кандыдаты. Напрыклад, чаму адзін з іх не раскрывае сапраўдныя прычыны свайго звальнення і таго, адкуль прыйшлі грошы для вядзення яго выбарчай кампаніі.

«Задайце яму адно пытанне: што такое кампанія «ПрыватЛізінг»? — параіў ён наконт іншага прэтэндэнта. — Няхай растлумачыць, што такое інвестыцыі ў дзеючае дзяржпрадпрыемства (скажам, МТЗ, я нядаўна быў на ім), пры якіх застанецца не 18 тысяч рабочых, а 1800?.. У мяне пытанне: чалавек прэзідэнтам увогуле збіраецца выбірацца? Я іх пакуль не крытыкую. Проста задаюся пытаннем».

Прэзідэнт дадаў, што ў яго складваецца ўражанне: некаторыя ўдзельнікі выбарчай кампаніі сапраўды прыйшлі за нечым грошы, каб дэстабілізаваць абстаноўку і перавярнуць краіну.

«Дык вось. Запомніце вы і ўсе, хто мяне пачуе. Краіну яны не атрымаюць! Мы два з лішнім дзясяткі гадоў, збіраючы пакрысе, стварылі вось гэту квітнеючую краіну не для таго, каб яны яе прыватызавалі і пусцілі па свеце... Мы ім не дазволім падзяліць Беларусь... Нам дасталася краіна, мы стварылі першую незалежную суверэнную дзяржаву. І мы гэтую краіну нікому не аддздім, каб з яе здзекаваліся, каб яе дэстабілізавалі штодня, парвалі на кавалкі і некаму аддалі», — заявіў беларускі лідар.

**Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА, Марыя ДАДАЛКА.**

## ГАЛОЎЧАНКА Раман Аляксандравіч



Нарадзіўся ў 1973 годзе ў Жодзіне. У 1996 годзе скончыў Маскоўскі дзяржаўны інстытут міжнародных адносін МЗС Расіі, у 2003 годзе — Акадэмію кіравання пры Прэзідэнце Беларусі.

У 1996—1997 гадах быў рэферэнтам старшыні праўлення, намеснікам генеральнага дырэктара ЗАТ «Белтэхэкспарт».

З 1997 да 2002 года — галоўны спецыяліст Дзяржаўнага сакратарыята Савета бяспекі Беларусі.

У 2002—2005 гадах — намеснік начальніка аддзела па наглядзе за выкананнем законаў у ваенна-прамысловым комплексе пракуратуры Беларусі.

Затым да 2006 года быў галоўным саветнікам упраўлення знешняй палітыкі Адміністрацыі Прэзідэнта Беларусі.

У 2006—2009 гадах — галоўны саветнік аддзела супрацоўніцтва ў сферы міжнароднай бяспекі, галоўны саветнік упраўлення міжнароднай бяспекі Дзяржаўнага сакратарыята Савета бяспекі.

З ліпеня да снежня 2009 года — саветнік-пасланнік пасольства Беларусі ў Польшчы.

Затым назначаны першым намеснікам старшыні Дзяржаўнага ваенна-прамысловага камітэта Беларусі, займаў гэту пасаду да 2013 года.

У красавіку 2013 года стаў Надзвычайным і Паўнамоцным Пасла Беларусі ў Аб'яднаных Арабскіх Эміратах, пазней па сумяшчальніцтве ў Катары, Кувейце і Саудаўскай Аравіі.

З жніўня 2018 года да чэрвеня 2020 года займаў пасаду старшыні Дзяржаўнага ваенна-прамысловага камітэта.

У чэрвені 2020 года назначаны прэм'ер-міністрам Беларусі.

## СНАПКОЎ Мікалай Генадзевіч



Нарадзіўся ў 1969 годзе ў Магілёве. У 1991 годзе скончыў Беларускую сельгасакадэмію, у 2001-м — Акадэмію кіравання пры Прэзідэнце Беларусі.

У 1990—1994 гадах працаваў эканамістам, старшым эканамістам, бухгалтарам на сельгаспрадпрыемствах Магілёўскай і Гродзенскай абласцей, у 1994—1996 гадах — эканаміст, галоўны эканаміст, намеснік кіраўніка ў Дрыбінскім аддзяленні Белаграпрамбанка, у 1996—2000 гадах — намеснік старшыні па пытаннях эканомікі, рынкавых адносін і прыватызацыі Горацкага райвыканкама.

У 2000—2007 гадах працаваў начальнікам фінансавага ўпраўлення Магілёўскага аблвыканкама, у 2007—2009 гадах — намеснікам старшыні Магілёўскага аблвыканкама.

Са студзеня 2009 года працаваў намеснікам кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Беларусі. У 2009—2014 гадах быў міністрам эканомікі Беларусі.

Са снежня 2014 года да студзеня 2020 года — намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Беларусі.

У студзені 2020 года прызначаны Надзвычайным і Паўнамоцным Паслом Беларусі ў Кітаі.

У чэрвені 2020 года назначаны першым намеснікам прэм'ер-міністра Беларусі.

## СУБОЦІН Аляксандр Міхайлавіч



Нарадзіўся ў 1976 годзе ў Віцебску. Скончыў Віцебскую дзяржаўную акадэмію ветэрынарнай медыцыны і Міжнародны інстытут менеджменту. Доктар біялагічных навук, прафесар.

Працаваў прафесарам пры кафедры ва УА «Віцебская ордэна «Знак Пашаны» дзяржаўная акадэмія ветэрынарнай медыцыны». Са снежня 2015 года да верасня 2017 года працаваў намеснікам міністра сельскай гаспадаркі і харчавання Беларусі — дырэктарам Дэпартамента ветэрынарнага і харчовага нагляду.

З верасня 2017 года да верасня 2018 года — памочнік Прэзідэнта Беларусі — інспектар па Віцебскай вобласці.

З верасня 2018 года да сакавіка 2020 года — член Калегіі (міністр) па прамысловасці і аграпрамысловым комплексе Еўразійскай эканамічнай камісіі (ЕЭК).

З сакавіка 2020 года — памочнік Прэзідэнта Беларусі — інспектар па Магілёўскай вобласці.

З чэрвеня 2020 года — намеснік прэм'ер-міністра Беларусі.

Далучайцеся!

# ЭНЕРГІЯ СОНЦА ДЛЯ ЗЯЛЁНЫХ ШКОЛ

**У Сусветны дзень навакольнага асяроддзя ў краіне стартуе адукацыйны праект, мэта якога — на практыцы паказаць карысць энергіі з аднаўляльных крыніц**

**Чатыры партнёры — Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя, Міністэрства адукацыі і Праграма развіцця ААН у Беларусі і кампанія А1 — 5 чэрвеня запускаюць новы конкурс «Энергія сонца для зялёных школ».**

Каб стаць яго ўдзельнікам, установам адукацыі, якія маюць статус «Зялёная школа», трэба будзе адправіць заяўку арганізатарам па спецыяльнай форме. Па крытэрыям, указаным у палажэнні конкурсу, у кожнай вобласці і Мінску вызначаць па адным пераможцу — усяго сем «зялёных школ». У іх установяць панэлі для пераўтварэння сонечнай энергіі ў электрычную, а таксама спецыяльнае асвятляльнае і акумулюючае абсталяванне для нагляднай дэманстрацыі вынікаў работы сонца школьнікам.

— Для кампаніі А1 экалогія і ахова навакольнага асяроддзя з'яўляюцца важным стратэгічным кірункам карпаратыўнай сацыяльнай адказнасці. Мы прынялі рашэнне падтрымаць праект ПРААН, Мінпрыроды і Мінадукацыі «Зялёныя школы», прапанаваўшы сваю тэхнічную экспертызу і ўзяўшы на сябе рэалізацыю ўсіх аспектаў, звязаных з укараненнем і эксплуатацыяй абсталявання на сонечнай энергіі. Мы бачым асаблівую каштоўнасць праекта ў тым, што ён аб'ядноўвае экалогію і адукацыю і акцэнтуе магчымасць выкарыстання энергіі з аднаўляльных прыродных крыніц у паўсядзённым жыцці, — адзначыў першы **намеснік генеральнага дырэктара кампаніі А1 Мікалай ЮШКЕВІЧ.**

Адна з галоўных мэт праекта «Энергія сонца для зялёных школ» — паказаць на практыцы кожнаму вучню, якую карысць прыносіць энергія з аднаўляльных крыніц (у нашым выпадку — сонечная энергія). Плануецца, што яго рэалізацыя зробіць экалагічную інфармацыю больш даступнай для вучняў, а таксама паслужыць рухаючай сілай у вырашэнні лакальных экалагічных праблем.

— У Сусветны дзень навакольнага асяроддзя мы пачынаем рэалізацыю гэтага пілотнага праекта, які дазволіць навучэнцам, школьнікам наглядна пазнаёміцца з перагамі сонечнай энергіі, будзе спрыяць фарміраванню беражлівага стаўлення да выкарыстання энергіі, стане яркай старонкай у дзейнасці новай адукацыйнай мадэлі «Зялёныя школы», — выказала ўпэўненасць **начальнік галоўнага ўпраўлення экалагічнай палітыкі, міжнароднага супрацоўніцтва і навукі Мінпрыроды Таццяна КАНАНЧУК.**

Падрабязную інфармацыю пра ўдзел у конкурсе можна знайсці на афіцыйным сайце кампаніі А1 www.a1.by.

**«Зялёныя школы» — адукацыйны праект, накіраваны на фарміраванне ў школьнікаў каштоўнаснага стаўлення да прыроды, павышэнне ўзроўня экалагічнай скіраванасці адукацыі, інфармаванасці моладзі па пытаннях аховы навакольнага асяроддзя і рацыянальнага выкарыстання прыродных рэсурсаў, выхаванне. Работа ў рамках праекта вядзецца па пяці кірунках, адзін з якіх — «Энергазберажэнне».**

**Праграма была адаптавана для Беларусі ў рамках праекта «Павышэнне экалагічнай інфармаванасці моладзі праз заснаванне і развіццё «Зялёных школ» у Беларусі», які фінансаваўся Еўрапейскім саюзам і рэалізоўваўся Праграмай развіцця ААН у Беларусі ў партнёрстве з Міністэрствам прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя.**

**Стаць удзельнікам экалагічнага руху можа любая школа, школьнае лясніцтва, цэнтр пазашкольнай работы, экалагічны цэнтр для дзяцей і юнацтва Беларусі. Сёння ўжо больш за 50 устаноў маюць сертыфікат «Зялёнай школы».**

**Вераніка КОЛАСАВА.**

# ЗВАНІЦЕ Ў СУБОТУ РАНІЦАЙ

**Традыцыйна па суботах аблвыканкамамі і Мінскім гарвыканкамам праводзіцца прамыя лініі ў мэтах павышэння эфектыўнасці работы са зваротамі грамадзян і юрыдычных асоб, выкаранення фактаў бюракратызму і цяганіны, папяратворчасці, а таксама для аператыўнага вырашэння праблемных пытанняў, якія ўзнікаюць у людзей.**

Тэлефонныя лініі ў суботу, 6 чэрвеня, з 9.00 да 12.00 правядуць:

- намеснік старшыні Брэсцкага аблвыканкама Генадзь Іосіфавіч БАРЫСЮК. Тэл. 8 016 221 31 21;
- першы намеснік старшыні Віцебскага аблвыканкама Алег Сяргеевіч МАЦКЕВІЧ. Тэл. 8 021 222 22 22;
- старшыня Гомельскага абласнога Савета дэпутатаў Кацярына Анатолеўна ЗЕНКЕВІЧ. Тэл. 8 023 233 12 37;
- кіраўнік спраў Гродзенскага аблвыканкама Ігар Андрэевіч ПАПОЎ. Тэл. 8 015 273 56 44;
- кіраўнік спраў Магілёўскага аблвыканкама Рыгор Аляксандравіч ВАРОНІН. Тэл. 8 022 250 18 69;
- кіраўнік спраў Мінскага аблвыканкама Уладзімір Аляксандравіч ГУРЫНОВІЧ. Тэл. 8 017 500 41 60;
- намеснік старшыні Мінскага гарвыканкама Юрый Уладзіміравіч ТРУШЧАНКА. Тэл. 8 017 222 44 44.

**Дэпутаты Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь смуткуюць у сувязі са смерцю дэпутата Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь трынаццатага склікання, дэпутата Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь першага, другога, трэцяга скліканняў Васіля Пятровіча ХРОЛА і выказваюць глыбокія спачуванні яго родным і блізкім.**

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

## Германія павялічыла пакет мер па падтрымцы эканомікі да 1,3 трлн еўра



Урад Германіі зацвердзіў другі пакет стымуляцыйных мер з пачатку пандэміі каранавіруса, памер якога складае 130 млрд еўра. Гэтыя стымулы разлічаны на 2020 і 2021 гады. Такім чынам, агульны аб'ём мер падтрымкі эканомікі дасягнуў 1,3 трлн еўра. Гэта найбуйнейшы паказчык па адносінах да ВУП у Еўропе. Неўзабаве пасля пачатку лакдаўна ў сувязі з пандэміяй Германія прыняла пакет мер, які ўключае прамыя выплаты ў памеры 353,3 млрд еўра і гарантыі на суму 819,7 млрд еўра. «Мы спрабуем выйсці з гэтай вельмі складанай сітуацыі разам», — сказала канцлер Ангела Меркель пасля зацвярджэння пакета мер і каментуючы яго маштаб. Пакет прадугледжвае падтрымку буйных і дробных кампаній, работнікаў і іх сем'яў.

## Apple блакіруе смартфоны, украдзеныя падчас пратэстаў у ЗША



Кампанія Apple адсочвае і блакіруе смартфоны, якія былі ўкрадзеныя з фірменных магазінаў падчас пратэстаў у ЗША, паведамляе тэлеканал CNN. Паводле інфармацыі тэлеканала, скрыншоты з паведамленнямі ад Apple, якія прыходзяць на ўкрадзеныя тэлефоны, пачалі з'яўляцца ў сацыяльных сетках і розных сайтах у пачатку гэтага тыдня. У іх кампанія паведамляе карыстальніку, што тэлефон заблакіраваны і адсочваецца, і просіць вярнуць яго назад у краму, адрас якой таксама прымацаваны ў паведамленні. CNN нагадвае, што фірменныя магазіны ў ЗША пачалі адкрываць толькі нядаўна пасля часовага прыпынення іх работы ў сувязі з успышкай новай каранавіруснай інфекцыі. Некаторыя з іх, у тым ліку крамы ў Нью-Ёрку, Філадэльфіі і Вашынгтоне, ужо паведамілі аб крадзяжах і вандалізме.

## Карціну Айвазоўскага прадалі з анлайн-таргоў за рэкордную суму



Работа Івана Айвазоўскага «Неапалітанскі заліў» была прададзеная на аўкцыёне Sotheby's у Лондане за рэкордную для анлайн-таргоў суму — 2,3 мільёна фунтаў (2,88 млн долараў), паведамілі ў прэс-службе аўкцыённага дома. Падчас таргоў кошт манументальнага палатна ўдвая перавысіў ацэначны паказчык (800 тысяч — 1,2 млн фунтаў), і яно стала самай дарагой работай, прададзенай на анлайн-таргах, адзначаецца ў Sotheby's не ўдакладнілі, з якой краіны быў пакупнік. Да продажу карціна знаходзілася ў еўрапейскай прыватнай калекцыі. Акрамя «Неапалітанскага заліва» на аўкцыёне былі выстаўлены і іншыя палотны рускіх мастакоў, за якія ўсяго было атрымана 5,6 мільёна фунтаў.

# «ДЗЯКУЙ ЗА ВАШУ ПРАЦУ! ВЫ — ГЕРОІ НА ЎСЕ ЧАСЫ!»

## Першыя кантактныя пацыенты — студэнты БНТУ

Перад будынкам, як і заўсёды, шматлюдна — мамы ці таты з калясками, самакатамі і, зразумела, з самімі маленькімі пацыентамі. Медыцынская сястра на ўваходзе вымярае тэмпературу як дзецям, так і бацькам. Навёдвальнікі ставяцца да такой меры з разуменнем, хіба што ўдакладняюць: 36,6? Хол перад ліфтамі ўпрыгожваюць падзякі медыкам — лісты і паштоўкі ад бацькоў, настаўнікаў і проста нераўнадушных. «Дзякуй за вашу працу! Вы — героі на ўсе часы!» — ад гэтых простых слоў да горла падступае камяк, і мы накіроўваемся размаўляць з тымі, хто сёння дапамагае змагацца з хваробай.

3-я дзіцячая паліклініка, дарэчы, пачала працаваць з кантактамі першага і другога ўзроўняў з самага пачатку распаўсюджвання інфекцыі. Студэнты БНТУ, што жывуць на тэрыторыі яе абслугоўвання і вучацца разам з іранскім студэнтам, у якога першага ў Беларусі быў выяўлены каранавірус, якраз і сталі яе пацыентамі (па правілах падлеткі да 18 гадоў абслугоўваюцца ў дзіцячай паліклініцы). Кожны з іх быў узяты на ўлік, урачы ўсіх наведалі дома і назіралі за іх станам.

— Яшчэ да таго, як у Беларусі з'явіўся першы пацыент, мы адпрацоўвалі тактычныя дзеянні па меркаванай сустрэчы з каранавіруснай інфекцыяй, — расказвае **намеснік галоўнага ўрача па медыцынскай частцы 3-й гарадской клінічнай дзіцячай паліклінікі Мінска Вера ПАЯРКОВА.** — Падрыхтаваліся максімальна: правялі вучэнні па асабліва небяспечных інфекцыях, заняткі па надзяванні сродкаў індывідуальнай аховы, усё старанна прапрацавалі з кожным супрацоўнікам. Інфармацыю пра меры дыстанцыявання, апрацоўку рук, нашэнне масак, рэспіраторны этыкет размясцілі на сайце, у сацыяльных сетках, расклеілі па паверхах, даносілі ў размовах з пацыентамі.

У лютым—сакавіку пад назіраннем былі адзінкавыя дзеці, у асноўным тыя, хто вярнуўся з бацькамі з адпачынку з-за мяжы.

— Першыя пацыенты са станоўчымі тэстамі на COVID-19 з'явіліся ў сакавіку. Згодна з нарматыўнымі дакументамі, калі яны адчувалі сябе нармальна, бацькі адмаўляліся ад шпіталізацыі і былі згодны выконваць патрабаванні аб самаізаляцыі, іх назіралі дома на працягу 14 дзён. У тым ліку і дыстанцыйна — штодзённа ўрач размаўляў па «Вайберы». У той час такіх дзяцей было няшмат — 2—5, — адзначае намеснік галоўнага ўрача.

У красавіку колькасць пацыентаў павялічылася, у прыватнасці, за кошт кантактаў першага ўзроўню, яшчэ больш іх стала ў маі.

— Цяпер па назіраннях дзяцей крыху больш — і кантактаў першага ўзроўню, і кавід-станоўчых пацыентаў. На тэрыторыі абслугоўвання нашай паліклінікі яны складаюць 1,8 % ад агульнай колькасці дзяцей. Але гэта невялікая лічба, — кажа Вера Паяркова.

## Большасць — у лёгкай і бессімптомнай формах

Каля 95 % інфіцыраваных дзяцей хварэюць у лёгкай і бессімптомнай формах. Калі ў іх і з'яўляюцца сімптомы, то як у звычайнай рэспіраторнай інфекцыі: невялікі пад'ём тэмпературы, адзінкавыя катаральныя праявы.

— Часта сустракаецца бессімптомнае цячэнне — на працягу ўсяго перыяду назірання ў такіх пацыентаў станоўчыя тэсты, але няма ніякіх праяў: ні тэмпературных, ні катаральных. Бываюць выпадкі лёгкага цячэння каранавіруснай інфекцыі. Гэта эпізадычны пад'ём тэмпературы — 37,2, вяласць, слабасць, боль у горле. Ёсць такія дзеці, у якіх тэмпература паднімаецца да субфебрыльнай, парушаецца нюх, назіраюцца лёгкія сімптомы інтаксікацыі — галаўны боль, слабасць, лёгкі кашаль, — расказвае медык.

Асаблівая ўвага пры станоўчым тэсце звяртаецца на дзяцей, якія знаходзяцца на дыспансерным уліку з бранхіяльнай астмай, цукровым дыябетам.

— Іх, як правіла, таксама назіраем дома: калі не развіваецца бранхіт і пнеўманія, яны не шпіталізуюцца. Калі раптам ёсць яркія праявы кашлю і доктар падазрае, што пачынаецца бранхіт, а аналіз крыві сведчыць, што далучаецца бактэрыяльная інфекцыя, прызначаем антыбіётык, але зноў-такі гэта лячэнне дома. Шпіталізуем, калі тэмпература павышаецца да 39-40 градусаў, аднак такое бывае вельмі рэдка. Ніхто са шпіталізаваных дзяцей не мае ні пнеўманіі, ні патрэбы ў апараце ШВЛ і назіранні рэаніматолагаў — дзякуй богу, гэта не пра дзіцячы ўзрост, — дзеліцца суразмоўніца.



Медыкі апошнім часам атрымліваюць шмат падзяк.


Участковы педыятр Юлія ШАЛАМІЦКАЯ і медсястра Дар'я ГУТКОЎСКАЯ.

Часам юныя пацыенты шпіталізуюцца і па сацыяльных паказаннях — такое здараецца, калі раптам усе члены сям'і трапілі ў бальніцу і дзіця засталося адно. Нядаўна ў 17-гадовай школьніцы абодва бацькі апынуліся ў стацыянары, яе таксама давялося шпіталізаваць, нягледзячы на тое што ніякіх праяў хваробы дзяўчына не мела.

Па назіраннях спецыялістаў, бацькі больш пільна сталі ставіцца да здароўя дзяцей і старанна праводзяць усе санітарна-гігіенічныя мерапрыемствы. Прамыванне носа, паласканне горла, не кажучы ўжо пра частае мыццё рук, дазваляюць не запускаць насмарк ці ангіну і пазбягаць той жа каранавіруснай інфекцыі.

— Лекаў ад каранавіруса няма, на яго не дзейнічаюць антыбіётыкі. Таму лячэнне толькі сімптаматычнае. Гэта дамашні рэжым, частае цёплае піццё, правілы рэспіраторнага этыкету і санітарна-гігіенічныя мерапрыемствы па эліміныцыі віруса з верхніх дыхальных шляхоў. Усё гэта вядзе да выздараўлення, — тлумачыць Вера Паяркова.

## На дом выязджаюць нават кардыёлаг і лор-урач

Для назірання за пацыентамі з каранавіруснай інфекцыяй з сярэдзіны красавіка ў паліклініцы сфарміраваны выязныя брыгады, куды ўваходзяць урач-педыятр і медыцынская сястра. Калі неабходны аналіз крыві, у кантактную брыгаду ўключаецца фельчар-лабарант. Калі патрабуецца агляд вузкага спецыяліста — кардыёлага, лор-урача, — такія спецыялісты таксама выязджаюць да пацыента.

— Нядаўна нованароджанае дзіця, выпісанае з раддома, стала кантактам першага ўзроўню. Яму былі рэкамендаваны агляд кардыёлага і кардыяграма. Наш медыцынскі персанал зрабіў усе неабходныя працэдуры дома. Праз некаторы час наш пацыент быў зняты з назірання.

«Мінскаўтатранс» забяспечвае медыкаў спецыяльна абсталяванымі аўтамабілямі для выездаў. У дзень брыгада паспявае наведаць ад 10 да 30 пацыентаў і нават больш. Медыкі выконваюць урачэбны агляд, забор мазкоў, запаўняюць медыцынскую дакументацыю. У іх распараджэнні ёсць бескантактавыя тэрмометры і пульсаксіметры для вымярэння ўзроўню сатурацыі (насычэння крыві кіслародам). Істотна паскараюць пастаноўку дыягназу і экспрэс-тэсты на COVID-19. Акрамя таго, штодзень кожнаму пацыенту тэлефануе ўчастковы педыятр і ўдакладняе стан.

— Я лічу, што нашы дзяўчаты ў белых камбінезонах — героі. У цяперашні час выпрабоўваюцца ўсе чалавечыя якасці. І з гонарам скажу, што адмоў ад нашых медработнікаў мы не чуем: трэба працаваць больш — значыць, працуюць, трэба выйсці ў нядзелю — выходзяць і едуць на візіты, — расказвае намеснік галоўнага ўрача.

Паліклініка не мае патрэбы ў сродках індывідуальнай аховы, але ўдзячна бацькам, якія аказалі спонсарскую дапамогу.

— Прывозілі маскі, аднаразовыя камбінезоны — проста пакідалі каробкі, нават не паведамляючы свае прозвішчы. Мы вельмі ўдзячны гэтым людзям. Цяпер у нас наладжаны закупкі, ёсць запас акуляраў, шчыткоў, масак, камбінезонаў, дэзсродкаў.

Паводле назіранняў медыкаў, у 80 % выпадкаў заражэнне дзяцей адбываецца ў сем'ях, дзе інфіцыруецца хтосьці з дарослых, прычым старэйшага ўзросту — бабулі ці дзядулі, калі сем'і жывуць пакаленнямі. Пасля канікул сталі з'яўляцца выпадкі інфіцыравання ў школах. Але зноў жа, носьбітамі і хворымі часцей за ўсё станавіліся дарослыя — настаўнік ці выхавацель.

Дарэчы, дзеці, якія пераносяць каранавірусную інфекцыю ці з'яўляюцца кантактамі першага ўзроўню, вызваляюцца ад выпускных экзаменаў. Падчас самих іспытаў школы выконваюць рэкамендацыі па дыстанцыраванні, санапрацоўцы, нашэнні масак.

## Не адчыняюць дзверы і ўспрымаюць агрэсіўна

Усе бацькі атрымліваюць ад медыкаў патрабаванне аб самаізаляцыі, але не ўсе іх выконваюць. Інфармацыя паступае і ў РУУС, якое таксама праводзіць праверкі. Некаторыя бацькі катэгарычна не жадаюць пускаць медыкаў дадому і абследавацца.

— Людзі проста не адчыняюць дзверы кантактнай групе. Некаторыя агрэсіўна ўспрымаюць інфармацыю, што яны з'яўляюцца кантактамі першага ўзроўню. Складана працаваць з падлеткамі і іх бацькамі. У школе кожнае дзіця інфармуюць, што настаўнік захварэў і трэба знаходзіцца ў самаізаляцыі. Некаторыя бацькі негатыўна ставяцца да такіх звестак. Тэлефануеш ім — абяцаюць быць дома, прыязджае брыгада — іх няма. Але мы вядзём пастаянныя тэлефонныя перамовы з такімі людзьмі — часам і некалькі дзён патрэбна. У выніку яны пагаджаюцца, просяць прыехаць і ўзяць мазкі. Падлеткі таксама часта ігнаруюць патрабаванні — выходзяць на вуліцу. Але дзякуючы і праваахоўнікам, і нашым тэлефанаванням паддаюцца на ўгаворы і яны, — кажа Вера Паяркова.

Напрыканцы медык нагадвае пра прышчэпкі. Яна ўпэўнена, што многія бацькі, якія раней адмаўляліся ад вакцынацыі, перагледзелі сваё стаўленне да гэтай працэдуры ці зробяць гэта ў найбліжэйшыя месяцы.

— Тых дзяцей, хто правільна вакцынаваўся, вельмі мала сярод інфіцыраваных — у іх спрацаваў імунітэт. Планавыя прышчэпкі ў паліклініцы мы не адмянялі. І дзеці ад нуля да года актыўна прышчапляліся згодна са сваім графікам. І нават тыя, хто раней адмаўляўся, цяпер актыўна пачалі вакцынавацца — зразумелі, што трэба трэніраваць імунную сістэму для сустрэчы з інфекцыяй з нараджэння.

### Мовай лічбаў

*Па звестках на 4 чэрвеня ў Беларусі выяўлены 45 981 выпадак COVID-19. Паправіліся і выпісаны 21 162 пацыенты, 253 чалавекі з пачатку распаўсюджання інфекцыі памерлі. Праведзена 585 065 тэстаў. За апошнія суткі прырост склаў 865 новых выпадкаў, выпісаны пры гэтым 991 пацыент (другі дзень запар колькасць выпісаных перавышае лічбу новых выпадкаў), пяць пацыентаў выратаваць не ўдалося.*

**Алена КРАВЕЦ, фота аўтара.**

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*




## РЫБКА ДЛЯ ЗАЙКІ

...Прачытала ў любімай рубрыцы гісторыю пра тое як два рыбакі, налавіўшы рыбы і нават размеркаваўшы яе на «кучкі» (мне, табе, маёй цешчы, тваёй маме...), прымудрыліся адпусціць яе назад у раку, і міжволі ўспомніла... бальніцу.

У той палаце я была пятай: чатыры жанчыны маладзейшыя, гадоў па 20—25, і адна старэйшая. Выглядала яна недзе на 35, а калі па праўдзе, то, можа, і болей было, але звалі яе чамусьці Рыбкай. Я падумала, што гэта, відаць, з-за прозвішча — Рыбак, Рыбко... І памылілася. Прозвішча было ні пры чым.

Як расказалі суседкі па палаце, Зоя (назавём Рыбку так) змалку хацела быць не нейкай там юрысткай ці праграмісткай, а хатняй гаспадыняй і... мамай. Адна дачка ў бацькоў, яна, што называецца, спала і бачыла, як створыць вялікую сям'ю, як нарodзіць траіх, а можа, і пяцярых дзяцей... Прычым з гэтай, досыць нетыповай мары, не рабіла ніякіх сакрэтаў: пра яе ведалі і Зоіны бацькі, і аднакласнікі, і настаўнікі ў школе (яна ў сачыненнях пісала)...

Не выключана, што пра тое ж, трохі падросшы, яна расказвала і хлопцам, бо праміналі, пралеталі гады, а ў Зоі па-ранейшаму не было не толькі дзяцей, а нават мужа.

...Так бывае, на жаль: мары пра вялікую сям'ю не сталі збывацца і потым, калі муж з'явіўся. Факт, што, не дачакаўшыся цяжарнасці ў першыя тры месяцы, Зоя звольнілася з работы і пайшла-паехала па дактарах ды знахарах. Дзе яна толькі ні ездзіла і чаго ні спрабавала (муж катэгарычна адмовіўся, бо меў дачку ад першага шлюбу), але толку не было ніякага. У хаце ўсё часцей і часцей разгараліся спрэчкі, узнікалі зацяжныя разлады...

Дык вось аднойчы, пасля чарговага, муж прыйшоў мірыцца не з кветкамі, не з ананасам і тортам, нават не з наборам каструль. Ён прынёс дамоў трохлітровы слоік, у якім плавала прыгожая залатая рыбка (акварыум у іх ужо быў), сказаў: «Ну, загадвай жаданні. Тры з іх — бяруся выканаць».

Зоя тут жа памкнулася сказаць, што жаданне ў яе — адно: каб ён урэшце праверыўся, але прамаўчала — пабаялася, што зноў пасварацца, а якраз тады — проста нельга было.

Справа ў тым, што яны разам з бацькамі купілі дом у прыгарадзе і яшчэ толькі запрагалі яго ў рамонт, у дравядзенне яго да ладу. Муж, вядома ж, рабіў асноўнае... Ды і Зоя неяк захапілася: згадзілася, як быццам, што галоўнае дом свой, а дзяцей можна ўзяць і чужых.

...Карацей, два месяцы яна апантана шчыравала: вычышчала, вымывала, расстаўляла і не хадзіла да свайго гінеколага. А калі нарэшце прыйшла, той адразу павёў яе на ультрагук, доўга прасвечваў» там, глядзеў на экран і ўрэшце сказаў: «Віншую, у вас будзе трое...»

«Гэта ўсё рыбка, рыбка!» — залапатала тады Зоя.

І потым пра яе, залатую, гаварыла ўсім, ва ўсякім разе тым, з кім ляжала ў бальніцы.

Дарэчы, у нашай палаце яна самай здаровай была: на захаванне, як мы зразумелі, яе клалі так, на ўсякі выпадак.

Вось такая чароўная гісторыя пра рыбку для Зайкі (ці Зойкі?).

Хочацца верыць, што сваіх малых яна паспяхова данасіла, лёгка нарадзіла і цяпер гадуе.

**Н. Бялевіч,**
*г. Мінск.*

## ЧАЛАВЕК — НЕ АРЭХ...

### АДРАЗУ НЕ РАСКУСІШ

Едзеш на лецішча і па дарозе амаль каля кожнай хаты бачыш парнік, а то недзе і два. Прычым драўляных, са шклом, альбо проста з плёнкай на дужках ужо не сустрэнеш. Усё больш ладныя белыя «будынінкі» — з полікарбанату.

Першая вось такая ў нашых Ніны з Валодзем з'явілася — ім зяцёк хвалёны прывёз.

Трэба сказаць, што дачка ў іх таксама не абы якая: і прыгожая, і старанная, і доктарка...

Аднак муж яе дык проста на зайздрасць быў! Ну ўсё ў яго найлепшае: і знешнасць, і адукацыя, і спрыт, і грошы... Трохпакаёўку ў Мінску пабудаваў, еўрапейскі рамонт зрабіў, пакоі імпартам абставіў, машыну з салона прыгнаў... «Сяргейка наш усё чыста ў дом, у сваю сям'ю, — выхвалялася часам цешча. — Ён нідзе нічога не ўпусціць! І тут, у вёсцы, ну паглядзіце, то бярозавік збірае, то грыбы-ягады з лесу носіць, то на рыбу ідзе... Мы з дачкой ледзь паспяваем парадкаваць... Сотні розных слоікаў ставім на зіму».

Пашчасціла, карацей, сямейцы. Так лічылі суседзі, але ж да пары да часу.

Гадоў з восем назад той самы Сяргейка не проста ў госці прыехаў — дарагую цяпліцу з сабою прывёз. Распакаваў, інструкцыю вывучыў і пачаў мантаж. Сам, сваімі рукамі ўсё рабіў, нікога не падпускаў. Стойкі ўкапаў (зямля, праўда, мяккая была, свежаўзараная), алюмініевыя рэйкі як след прыкруціў, полікарбанат нацягнуў...

Суседзі завохкалі ды залюбаваліся, цешча — яшчэ больш заганарылася...

Цесць, праўда, крыху пакрыўдзіўся: хацеў жа і ён прычыніцца, нешта параіць, можа, падмагчы... Зяць як адрэзаў — сказаў: «Не трэба...»

«Не дык не, — згадзіўся гаспадар. — Сам рабі, калі табе так хочацца».

За зяцем, як вы разумееце, справа не стала.

За агародніцамі-жанчынамі — і пагатоў: расаду з хаты вынеслі, памідоры з перцамі пасадзілі, радыскі насеялі...

А дзён праз колькі і як на тое ліха — вецер наляцеў... Ды такі ж шалёны...

Аднак парнік бы выстаяў, калі б быў закрыты, а так...

Пакрыццё аказалася моцнае, таму будыніну ўзнялo, рэйкі перакруціла, карбанат «пакамечыла», і ўсё разам занесла пад плот у канцы гарода — злажыла і палажыла.

Гаспадар гэты «буралом» чапаць не стаў: абыходзіў бокам. Гаспадыня таксама не пасмела.

...Зяць прыехаў у суботу раніцай. Пахадзіў вакол «развалін», паглядзеў. Вінаваціць, як быццам, няма каго, а хочацца, — ажно твар баліць...

Пасля лазні за чаркай не вытрымаў — папракнуў-такі цесця з цешчай, што вінаватыя, што павінны былі (?!) і не дагледзелі — не захавалі такую дыхтоўную пабудову, такую канструкцыю...

Цесць таксама не змаўчаў: злажыў сваю, з трох пальцаў... Сказаў яшчэ, што ў парабкі да панка не наймаўся і нічога яму не вінны...

Ну, а далей ужо ўсё загрымела і зашумела. Бедныя гаспадары на сваёй жа сядзібе сабе месца шукалі і знайсці не маглі — па суседзях пабеглі.

...Я гэта да таго, што ля кожнай хаткі свае парадкі і ў кожнай шафе ёсць свой шкілет. Калі-нікалі ён адтуль вывальваецца, каб пагрымець касцямі ды паказаць, хто чаго варты.

Ва ўсякім разе Ніна з Валодзем зяцем болей не хваляцца. І шчасцю іх дачкі вёска так не зайздросціць.

**Л. Міхальчык,**
*г. Магілёў.*

## ВАЖНЕЙ ЗА ЎСЁ ПАГОДА Ў ДОМЕ

Чым бы дзіця ні цешылася, абы не плакала. Пажадана, каб нікога да слёз не даводзіла. Але ж бывае па-іншаму.

Адзін мой знаёмы мастак, эстэт, вырашыў, напрыклад, хобі завесці, у калекцыянеры падацца. І добра б нейкія маркі збіраў ці нават сарты руж, а то ж — не паверыце — аўтамабілі: з гаражоў, з падваротняў ды стаянак стаў прыцягваць дамоў розныя развалiны. Сярод іх і старая «пабеда» была, і некалькі маленькіх гарбатых «запарожцаў», і велізарны «кадылак», і «трабант»... Нешта без колаў, нешта без дзверцаў, без рухавікоў, усё ржавае, аблезлае... Карацей, у чалавека не падворак стаў, а нейкі мехдвор даўно дабітай гаспадаркі.

І яшчэ ж мала, што ўсё гэтае дабро мастак дадому сцягваў. Ён, забыўшыся на работу і сям'ю, з галавой акунуўся ў рамонт, у аднаўленне машын... (Як на мой погляд, дык задавальненне гэта і вельмі сумнеўнае, і досыць дарагое. На яго, я чуў, і дзесяці вялікіх зарплат не хапіла б, а ў мастака і адной малой не было.)

З-за гэтага ў сям'і пастаянна разгараліся сваркі. Пачуўшы, што муж нейкую чарговую жалязяку набыў, жонка аж заходзілася ад злосці. А ўрэшце...

— Усё, — заявіла аднойчы, — майму цярпенню прыйшоў канец! Выбірай: альбо я, альбо гэтае ламачча!

Муж пачаў быў тлумачыць, што грошы, калі справа датычыцца мары, не маюць значэння, што ён — асоба творчая, што ў такіх, як правіла, ёсць захапленні, што добрыя жонкі павінны разумець...

— Дык я, значыць, дрэнная?! — спыніла мастака яго палавіна. — Ты хочаш сабе лепшую знайсці? Калі ласка! Наперад... Вунь бог, вунь парог...

— Ну і пайду, — заявіў мастак і ў той жа дзень пераехаў да маці.

Жонка, трэба сказаць, услед не пабегла, а нават горш — доўга не думаючы, выклікала «спецыялістаў», якія ў акрузе падбіралі металалом, і (сэрца не здрыганулася)... здала ўсю мужаву «калекцыю», моўчкі забрала грошы...

Недзе праз тыдзень, не вытрымаўшы разлукі, муж патэлефанаваў, сказаў, што зразумеў свае памылкі і цяпер ужо ведае: галоўнае — гэта сям'я, а потым усё астатняе... Ён стаў, што называецца, абрываць жончын тэлефон, вымольваць прабачэння і прасіць, каб дазволіла пачаць спачатку, гэта значыць, вярнуцца дамоў.

— А калі вернешся, ні ў чым не папракнеш? — папыталася жонка.

— Не... Нават слова не скажу!

— Ну глядзі ж... Ты абяцаў...

Такім чынам «міравое пагадненне», як быццам, было дасягнута: муж вярнуўся дамоў.

Трэба сказаць, што жонка сустракала яго ў новых высокіх боціках, у шыкоўнай скуранoй спадніцы ў абліпачку і моднай кароткай куртачцы. У мастака ад такога характара аж вочы заслыпіліся...

Факт, што пусты падворак за хатай ён агледзеў пазней...

Потым яму і сэрца забалела, і мову адняло...

Аднак што ты будзеш рабіць, калі прызнаў, што сям'я — даражэй за ўсё, калі жонцы слова даў ні ў чым не папракаць.

**Віталь Жураўскі,**
*г. Жодзіна.*

**Рубрыку вядзе Валянціна ДОЎНАР.**

***Ад яе ж*** *(і тым, хто не ведаў): пагода — паводле тлумачальнага слоўніка беларускай мовы — добрае надвор'е.*

*Кажуць, што сёлета яно такі будзе?*

*І, дай бог, каб не толькі на двары.*

*Пішыце! Конкурс на найлепшую вясёлую і праўдзівую гісторыю працягваецца. Журы працуе.*

Неасабісты суб'ектыў



# ПАЛЯВАННЕ НА ПРЫВІДА,

## або Як заахвоціць беларусаў вандраваць па Беларусі

ПАГАРТАЛА свае запісы і згледзела — роўна дваццаць тры гады назад, акурат пятага чэрвеня ў далёкім ужо 97-м мінулага стагоддзя мы ездзілі ў славутыя сёння Гальшаны з мэтай ні больш ні менш — калі не злавіць, дык хоць бы ўбачыць тамтэйшага прывіда. Тады ён толькі пачаў даваць пра сябе знаць, і двое маладых журналістаў вырашылі праверыць, ці ёсць там што сапраўды незвычайнае. Вырашылі нават пераначаваць у тым будынку, дзе прывід з'яўляўся. Начытаўшыся Караткевіча, рушылі ў мястэчка пад Ашмянамі. Настрой быў натхнёны і містычны, буйна красаваў бэз, а на небе акурат у той час (як, дарэчы, і сёлета) з'яўлялася жоўтая вялізная поўня... Калі, як не тады, і каму, як не нам, той прывід павінны быў аб'явіцца?

Дарэчы, пра Гальшанскага прывіда ў той час толькі пачалі гаварыць, і быў ён з'явай абсалютна мясцовага маштабу. З'яўляўся не ў замку — тым, хто быў там, не трэба тлумачыць, чаму: ад колісь прыгожага палаца ў канцы дваццатага стагоддзя засталіся адны зусім не маляўнічыя руіны. Прывід жа абраў у якасці рэзідэнцыі будынак былога францысканскага кляштара, што ў цэнтры мястэчка, побач з барокавым касцёлам. У таўшчэзных сценах, у якіх было халаднавата нават у летнюю спёку, у той час адбывалася сапраўды нешта нявытлумачанае. Прынамсі, так нас пераконвалі супрацоўнікі мастацкай галерэі, якая ў той час размяшчалася там. Нібыта і святло само запальвалася, і цені нейкія незвычайныя па пакоях шугалі. А прыезджыя рэстаўратары ды мастакі, якіх у кляштары начаваць пакідалі, і зусім літаральна па столі хадзілі — ці то мроілася ім тое, ці то сапраўды пачуццё гравітацыі страчвалі, і прывід іх уніз галавой цягаў... Праўда, даверу іх сведчанні асабліва не выклікалі, бо творчыя людзі — самі ведаеце... карацей, невядома, што яны перад тым, як легчы спаць, курылі ці выпівалі...

1. Победитель аукциона либо в случае если заявление на участие в аукционе подано только одним участником и он согласен приобрести Объект по начальной цене, увеличенной на 5 (пять) процентов (далее – Претендент на покупку), не позднее 3 (трех) рабочих дней со дня проведения аукциона на основании счета-фактуры возмещает затраты на организацию и проведение аукциона и оплачивает стоимость приобретенного объекта не позднее 20 (двадцати) рабочих дней со дня подписания протокола о результатах аукциона.

2. На Претендента на покупку распространяются правила и условия, установленные законодательством РБ для победителя аукциона. Организация и проведение аукциона осуществляются в соответствии с действующим законодательством РБ.

3. Порядок проведения аукциона, в том числе об оформлении участия в аукционе, указан на сайте **konfiskat.by** в разделе «Недвижимость».

**Аукцион состоится 09.07.2020 в 15.00 по адресу: г. Минск, ул. Уручская, 27, актовый зал**

Заявление на участие с приложением необходимых документов, в том числе документа, подтверждающего внесение суммы задатка (задатков) **с отметкой банка**, принимаются по адресу: г. Минск, ул. Жилуновича, 15, офис 318 (управление реализации недвижимости и арендных отношений) в рабочие дни: пн.–чт. – с 08.30 до 13.00, с 14.00 до 17.30, пт. – с 8.30 до 13.00, с 14.00 до 16.15. **Окончание приема заявлений – 06.07.2020 в 15.00.**

***Задаток перечисляется на р/с BY81POIS30120021178401933001, БИК POISBY2X, ОПЕРУ ОАО «Паритетбанк», 220002 г. Минск, пр-т Независимости, 77, ОКПО 37411910, получатель – РУП «Торговый дом «Восточный», УНП 101127633. Назначение платежа: задаток для участия в аукционе по продаже капитального строения (изолированного помещения), Лот № ___, проводимом 9 июля 2020 года.***

**Лот может быть снят с аукциона Организатором по письменному указанию Департамента по гуманитарной деятельности Управления делами Президента Республики Беларусь в любое время до объявления его проданным.**

**Контакты организатора аукциона: +375 17 378 87 02; +375 17 378 87 03; +375 44 763 62 63**

# «СЯМ'Я ПАЧЫНАЕЦЦА З ДЗЯЦЕЙ»

**ПА ГАРЫЗАНТАЛІ:** **1.** «Дзеці — ... Божая». Ул. Караткевіч. **4.** «Але касьба — ... лету. // О, колькі ў ім яшчэ прывету». З паэмы Я. Коласа «Новая зямля» («Летнім часам»). **8.** «Розныя дзеці — аднолькавы ... . // Смех у гадзіны забаў і пацех». З верша А. Вольскага «Дзеці». **9.** Што робіць ..., тое і ваўчаня (прык.). **11.** Дзяцей няма — у сям'і ... (прык.). **14.** Мохавае балота. **15.** ... бацькоў — у дзецях (прык.); 1 чэрвеня — Сусветны дзень бацькоў. **16.** Нашто ..., калі ў дзецях лад (прык.). **17.** «Дастаткова мець адно дзіця, каб запоўніць увесь дом і ...» М. Твэн. **20.** «..., якую спявае маці каля калыскі дзіцяці, суправаджае чалавека ўсё жыццё». Г. Бігер. **21.** Дэкаратыўнае пакрыццё ў выглядзе тонкага слоя белай або каляровай гліны. **26.** Сярэдзіна дня. **28.** Драпежная птушка; сарыч, канюк. **29.** «... пачынаецца з дзяцей». А. Герцэн. **30.** У каго дзеткі, у таго і ... (прык.). **31.** Які ..., такое і сена (прык.).

**ПА ВЕРТЫКАЛІ:** **2.** Дзе савет, там і ... (прык.). **3.** Мядзведзь, які зімой не спіць, а блукае па лесе (разм.). **5.** Лёгкі галаўны ўбор, які раней насілі замужнія жанчыны. **6.** Пра гордага, смелага чалавека (перан.). **7.** Птушка, якая ў чэрвені робіць штодня да 200 вылетаў з кубла, кормячы сваіх птушанят. **8.** Не сей пшаніцы, калі дзеці ідуць у ... (прык.). **10.** Конная гаспадарчая павозка. **12.** ... ў хаце, што аладкі ў мёдзе (прык.); 8 чэрвеня — Міжнародны дзень хатніх гаспадара і гаспадыні. **13.** «Гады дзяцінства — гэта перш за ўсё ... сэрца». В. Сухамлінскі. **18.** Ліпавы зараснік. **19.** Для ўнука дзядуля — розум, а ... — душа (прык.). **22.** Без маці і ... не грэе (прык.). **23.** «Падушачка, падушачка // Мая пухавая, // ... ў мамы дачушачка, // Дзеўка маладая». Прыпеўка. **24.** Юны карэспандэнт. **25.** ..., анёлак; ласкавы зварот да дзіцяці (разм.). **27.** Той, хто вельмі любіць пець.



**Склаў Лявон ЦЕЛЕШ,**
*г. Дзяржынск.*

**ПРАВЕРЦЕ, КАЛІ ЛАСКА, АДКАЗЫ:**
**Па гарызанталі:** 1. Усмешка. 4. Пачатак. 8. Смех. 9. Воўк. 11. Пустацвет. 14. Імшар. 15. Жыццё. 16. Клад. 17. Двор. 20. Песня. 21. Ангоб. 26. Полудзень. 28. Каня. 29. Сям'я. 30. Клопаты. 31. Чэрвень. **Па вертыкалі:** 2. Свет. 3. Шатун. 5. Чапец. 6. Арол. 7. Шпак. 8. Суніцы. 10. Калёсы. 12. Гаспадыня. 13. Выхаванне. 18. Ліпняк. 19. Бабуля. 22. Сонца. 23. Адна. 24. Юнкор. 25. Анёл. 27. Пяюн.

## СЁННЯ

### Сонца

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 4.41 | 21.36 | 16.55 |
| Віцебск — | 4.23 | 21.34 | 17.11 |
| Магілёў — | 4.31 | 21.26 | 16.55 |
| Гомель — | 4.37 | 21.13 | 16.36 |
| Гродна — | 4.58 | 21.49 | 16.51 |
| Брэст — | 5.08 | 21.41 | 16.33 |

### Месяц

*Поўня ў 22.12.*
*Месяц у сузор'і Стральца.*

### Імяніны

**Пр.** *Аляксандра, Андрэя, Івана, Канстанціна, Міхаіла, Пятра, Фёдара, Якава.*
**К.** *Валерыі, Зінаіды, Кіры, Ігара.*



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

## ЗАЎТРА




...у суседзяў




Даты | Падзеі | Людзі

**5 ЧЭРВЕНЯ**




**1870** год — нарадзіўся Зыгмунт Лазінскі, рымска-каталіцкі царкоўны дзеяч Беларусі. Спрыяў увядзенню беларускай мовы ў касцёлах, галоўным чынам падчас пастырскай дзейнасці ў Мінску ў 1918—1921 гадах. У 1918-м правёў першае беларускае набажэнства ў Мінску, быў арганізатарам беларускай каталіцкай семінарыі ў Мінску, пазней перанесенай у Навагрудак, а потым у Пінск.

**1905** год — нарадзіўся Андрэй Аляксеевіч Цітоў, удзельнік вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў у гады Вялікай Айчыннай вайны, Герой Савецкага Саюза.

**1910** год — нарадзіўся Зяма Раманавіч (Залман Рувімавіч) Піваварaў, беларускі паэт. Аўтар зборніка вершаў «Лірыка двух нараджэнняў». Выступаў як тэатральны рэцэнзент. Перакладаў на беларускую мову асобныя творы Пушкіна, Аксельрода і іншых. З 1934 года працаваў у газеце «Чырвоная змена». У 1936-м рэпрэсаваны, у 1937-м расстраляны. Рэабілітаваны ў 1958-м.



**1925** год — нарадзілася Эльвіра Пятроўна Герасімовіч, беларускі тэатральны дзеяч, кандыдат мастацтвазнаўства, прафесар, заслужаны дзеяч мастацтваў Беларусі.

**1950** год — нарадзілася Людміла Іванаўна Крывёнак, беларуская артыстка оперы (сапрана).

**2005** год — адкрыты для наведвальнікаў Добрушскі раённы краязнаўчы музей.




**1805** год — нарадзіўся Пётр Карлавіч Клот, рускі скульптар-анімаліст, ліцейны майстар. Член Акадэміі Святога Лукі ў Рыме, берлінскай Акадэміі мастацтваў і парыжскай Акадэміі прыгожых мастацтваў. Прадстаўнік позняга класіцызму.



**1898** год — нарадзіўся Федэрыка Гарсія Лорка, іспанскі паэт і драматург, вядомы таксама як музыкант і мастак-графік. Цэнтральная фігура групы «Пакаленне 27 года», якая ўкараніла прынцыпы еўрапейскіх рухаў (такіх як сімвалізм, футурызм і сюррэалізм) у іспанскую літаратуру. Адзін з самых яркіх і значных дзеячаў іспанскай культуры XX стагоддзя. Забіты ў пачатку грамадзянскай вайны ў Іспаніі.

**1945** год — у Берліне падпісана Дэкларацыя аб паражэнні Германіі і аб узяцці на сябе вярхоўнай улады ў адносінах да Германіі ўрадамі СССР, Злучанага Каралеўства, ЗША і Часовым урадам Французскай Рэспублікі.

**1955** год — уступіў у сілу Варшаўскі дагавор аб дружбе, супрацоўніцтве і ўзаемнай дапамозе.

**1965** год — Оксфардскі ўніверсітэт прысудзіў ганаровую ступень доктара літаратуры Ганне Ахматавай.

Так гаварыў...

**КАЗІМІР КАМЕЙША:**
*«Час і грошы — дзве рэчы, якіх заўсёды бракуе чалавеку».*

## УСМІХНЕМСЯ

**Жонка мужу, які ляжыць на канапе:**
**— Міхась, ты хочаш чаю?**
**— Так!**
**— Дык устань і завары!**
**— Тады не.**
**— Дык ляжы і не хлусі!**

— Я не магу з табою ажаніцца!
— Чаму?
— Кажуць, што ў цябе ўжо было шмат мужчын.
— Табе што, не падабаецца, як я гатую?
— Не, што ты! Такой смакаты я і не каштаваў!
— Тады, можа, табе не падабаецца, як я прыбіраю ў доме?
— Ды што ты! У цябе чысцей, чым у аперацыйнай!
— Можа, табе не падабаецца, як я прымаю гасцей?
— Ды што ты! Усе проста ў захапленні!
— Можа, я цябе ў ложку не задавальняю?
— Ды я нават і не ўяўляю, што можа быць так класна!
— Дык ты што, думаеш, што ўсяму гэтаму я на завочных курсах навучылася?

**Ні сораму, ні сумлення... Нічога лішняга.**




ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

Рэгістрацыйнае пасведчанне нумар 2 ад 17 лютага 2009 года, выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.

АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.

ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмная – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, маркетынгу — 337 44 04, бухгалтэрыі — 287 18 81.

прыём рэкламы тэл./факс: 287 17 79,
e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

www.zviazda.by

e-mail: info@zviazda.by

(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, праспр. Незалежнасці, 79/1. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.

Тыраж 14.804. Індэкс 63850. Зак. № 1839.

Нумар падпісаны ў 19.30 4 чэрвеня 2020 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

# МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

Штотыднёвы дадатак газеты ЗВЯЗДА

5 чэрвеня 2020 г. № 21 (557)

ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ


ТЭМА ТЫДНЯ

# Ад чыстай зямлі да чыстай планеты





Спрыяльнае навакольнае асяроддзе ствараецца там, дзе над гэтым працуюць на месцах — у гарадскіх мікрараёнах ці на вясковых падворках і вуліцах





Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

**МАЛЕНЬКІ прынц у аднайменнай казцы кожны дзень пачынаў з таго, што прыводзіў у парадак сваю планету. На жаль, сярод жыхароў Зямлі такога прынцыпу прытрымліваюцца пакуль не ўсе. Таму і ўзнікаюць дзе-нідзе смеццевыя звалкі, ламаюцца дрэвы, забруджваюцца азёры і рэкі... Але многія экалагічныя праблемы можна вырашыць, працуючы на месцах.**

## Парадак — ад слова «раіцца»

Каб пытанні добраўпарадкавання тэрыторый вырашаліся комплексна, у краіне штогод рэалізуюцца Рэспубліканскі план мерапрыемстваў па навядзенні парадку на зямлі і адпаведныя мясцовыя планы.

стар. 4

ПРАЕКТЫ І РАШЭННІ

# ЭНЕРГЕТЫЧНАЯ РЭІНКАРНАЦЫЯ

**Праз 121 год на месцы самай першай беларускай ГЭС пачала працаваць сучасная гідраэлектрастанцыя. Першая на тэрыторыі Гомельскай вобласці крыніца «зялёнай» энергіі пабудавана і ўведзена ў эксплуатацыю на рацэ Іпуць у Добрушы.**

Прамысловы раённы цэнтр Гомельшчыны другі раз за гісторыю свайго існавання стаў сведкам сапраўды гістарычнай падзеі. Вядома, што менавіта ў Добрушы ў 1899 годзе з'явілася першая на тэрыторыі сучаснай Беларусі гідраэлектрастанцыя. Зручнае месца для будаўніцтва ГЭС знайшлося тады амаль у цэнтры горада, на рацэ Іпуць. Водная артэрыя была прыдатна для гэтага, бо яшчэ на пачатку 70-х гадоў XIX стагоддзя на ёй пабудавалі дамбу. Такім чынам вырашалі праблему водазабеспячэння папяровай фабрыкі князя Паскевіча — аднаго з самых перадавых прадпрыемстваў свайго часу, якое не магло абыходзіцца без электрычнасці. Міні-ГЭС на Іпуці тады падарыла магчымасць асвятлення ў цэхах, запусціла станкі прадпрыемства.

стар. 14



## СЁННЯ Ў НУМАРЫ

### Форум рэгіёнаў



Сёлета беларуская сталіца і Мінская вобласць будуць прымаць яго ўдзельнікаў. стар. 2

### Экалогія сталіцы



Шэрынг ровараў, водараствaральныя фарбы, аздараўленне Свіслачы. стар. 13

### Знішчыць адходы



Больш за ўсё непрыдатных пестыцыдаў захоўваецца на Гомельшчыне, менш за ўсё — на Брэстчыне. стар. 13

### Чужынец супраць абарыгенаў



Як на Міншчыне змагаюцца з сумнікам канадскім. стар. 14

### Прыцягненне Юбілейнага



На беразе гэтага возера, што пад Гроднам, з'явілася атмасферная ратонда... ды не толькі. стар. 16

ФОРУМ РЭГІЁНАЎ

# Падрыхтоўка ў штатным рэжыме

**Учора адбылося пасяджэнне арганізацыйнага камітэта па падрыхтоўцы і правядзенні VII Форуму рэгіёнаў Беларусі і Расіі, якое прайшло пад кіраўніцтвам намесніка старшыні Савета Рэспублікі Анатоля ІСАЧАНКІ. Былі абмеркаваны рабочыя моманты і бягучыя арганізацыйныя пытанні правядзення мерапрыемства.**



У размове з журналістамі Анатоль Ісачанка нагадаў пра галоўную мэту чарговага Форуму рэгіёнаў Беларусі і Расіі — ён будзе прысвечаны вынікам і спадчыне агульнай Вялікай Перамогі. У гэтым яго адметная асаблівасць, звярнуў увагу намеснік старшыні Савета Рэспублікі. Прадстаўнікі рэгіёнаў абедзвюх дзяржаў аднадушна ўхвалілі тэму: «Гістарычная спадчына Вялікай Перамогі як аснова развіцця сацыяльна-эканамічных і духоўных сувязяў народаў Беларусі і Расіі».

Паводле слоў Анатоля Ісачанкі, за апошнія гады форум зарэкамендаваў сабе як актуальная і перспектыўная дыскусійная пляцоўка, дзе сустракаюцца парламентарыі, дзелавыя людзі, навукоўцы, моладзь і абмяркоўваюць надзённыя пытанні ўсебаковага развіцця інтэграцыйнага патэнцыялу рэгіёнаў дзвюх краін. Вось і цяпер мяркуецца грунтоўна разгледзець шэраг важных прапаноў і ініцыятыў, падпісаць кантракты, пагадненні аб супрацоўніцтве канкрэтных рэгіёнаў, увогуле наладзіць новыя кантакты.

На найбліжэйшую перспектыву запланавана правядзенне сумеснага пасяджэння аргкамітэтаў Беларусі і Расіі. Дата — 16 чэрвеня. Яно адбудзецца ў рэжыме відэаканферэнцыі, што ва ўмовах пандэміі і зразумела. У цэлым ужо вызначаны месцы сустрэч і парадак правядзення мерапрыемстваў форуму ў Беларусі.

Пра гэта падчас пасяджэння арганізацыйнага камітэта і гаварылі яго ўдзельнікі. Старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы Сяргей Рачкоў засяродзіўся на тэме секцыі № 5: «Беларусь і Расія: пашырэнне сумесных намаганняў па супрацьдзеянні гераізацыі нацызму на міжнародных пляцоўках». Работу секцыі запланавана правесці ў Беларускім дзяржаўным музеі гісторыі Вялікай Айчыннай вайны, у якім сама яго пераканаўчая экспазіцыя сведчыць аб гераізме савецкага народа ў барацьбе з нацызмам.

А ўдзельнікі секцыі № 3, якія абмяркуюць вытокі, ролю і значэнне подзвігу савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне, працаваць будуць на базе Нацыянальнай акадэміі навук.

У адпаведнасці з тэмай Вялікай Перамогі ў значнай ступені складзена і культурная праграма візітаў удзельнікаў форуму: Лінія Сталіна, Хатынь, Курган Славы і іншыя значныя гісторыка-культурныя аб'екты, якія ўтрымліваюць памяць аб Вялікай Айчыннай вайне.

У рамках VII Форуму пройдуць і маштабныя гаспадарчыя мерапрыемствы. Старшыня Пастаяннай камісіі па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні Савета Рэспублікі Міхаіл Русы адзначыў, што ўдзельнікі секцыі № 4 (каля 100 чалавек) будуць працаваць у Дзяржынскім раёне, дакладней, на базе знакамітага агракамбіната «Дзяржынскі». Там будуць абмяркоўвацца пытанні замацавання моладзі на вёсцы, павышэння яе сацыяльна-экамічнай актыўнасці ў аграпрамысловым сектары.

Пасяджэнне секцыі № 2 на транспартную тэматыку пройдзе ў Жодзіне на тэрыторыі завода БелАЗ, паведаміла старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па эканоміцы, бюджэце і фінансах Таццяна Рунец.

А вось работа секцыі № 1, як расказаў старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па заканадаўстве і дзяржаўным будаўніцтве Сяргей Сівец, адбудзецца на базе Нацыянальнай бібліятэкі. Усё ці амаль усё гатова для плённай сумеснай работы з расійскімі калегамі.

Па відэасувязі з удзельнікамі аргкамітэта звязаўся старшыня Беларускай гандлёва-прамысловай палаты Уладзімір Улаховіч. Ён пазнаёміў з падрыхтоўкай сумеснага пасяджэння Савета дзелавога супрацоўніцтва Беларусі і Расіі.

Аб правядзенні беларуска-расійскага маладзёжнага форуму прысутных праінфармавала начальнік сектара міжнародных адносін ЦК БРСМ Алеся Сазанкова. Яна расказала, што праграма сустрэчы ўжо ўзгоднена з партнёрамі з Расійскай Федэрацыі. Форум разлічаны на два дні, у ім прымуць удзел 50 чалавек. Маладыя людзі будуць працаваць у чатырох секцыях, прысвечаных, у прыватнасці, захаванню гістарычнай памяці аб Вялікай Айчыннай вайне, развіццю маладзёжнага прадпрымальніцтва і г. д.

Падчас пасяджэння арганізацыйнага камітэта Анатоль Ісачанка таксама паведаміў, што VII Форум рэгіёнаў як планавалася загадзя, адбудзецца гэтай восенню на тэрыторыі Мінска і сталічнай вобласці. Прыкладна ў канцы верасня. Хоць канчатковая дата яшчэ не вызначана. У форуме мяркуюць узяць удзел каля 500 прадстаўнікоў рэгіёнаў Беларусі і Расіі. Сярод іх на пленарным пасяджэнні будуць прысутнічаць і кіраўнікі дзяржаў. Ва ўсякім разе так запланавана.

**Леанід ЛАХМАНЕНКА.**

**Ва ўсе часы электральная кампанія выклікала павышаную зацікаўленасць у грамадстве, што мы, у прыватнасці, і назіраем зараз. Натуральна, людзей непакоіць, як будзе развівацца краіна ў найбліжэйшай (ды і, безумоўна, аддаленай) перспектыве. Таму невыпадкова дэпутаты ўсіх узроўняў, у тым ліку тыя, хто прадстаўляе інтарэсы людзей у абедзвюх палатах беларускага парламента, пачалі актыўна выказваць наконт гэтага сваю пазіцыю.**

# «Не варта блытаць рэалізацыю законнага выбарчага права з удзелам у несанкцыянаваных акцыях»



**Віктар ЧАЙЧЫЦ, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па заканадаўстве і дзяржаўным будаўніцтве, старшыня Беларускай рэспубліканскай калегіі адвакатаў (БРКА):**

— У Беларусі праходзіць прэзідэнцкая выбарчая кампанія, грамадзяне так ці інакш у яе ўцягнутыя. Але не варта блытаць рэалізацыю законнага выбарчага права з удзелам у несанкцыянаваных акцыях. Калегія адвакатаў нагадвае, што грамадзяне ў любой сітуацыі абавязаны выконваць заканадаўства. Парушаць яго, ганьбіць гонар і годнасць дзяржавы ў цэлым і асобных службовых асоб, апраўдваючы сябе правакацыяй альбо недазволенымі метадамі, прынамсі неразумна. Любыя канфлікты варта вырашаць у прававым полі. Заканадаўства Беларусі мае досыць шырокі інструментарый для абароны правоў фізічных і юрыдычных асоб.

Сенатар звярнуў увагу на тое, што ў інтэрнэце з'яўляецца інфармацыя ад асобных юрыстаў, якая падштурхоўвае людзей здзяйсняць правапарушэнні, а потым шукаць у іх дапамогі і абароны. «Гэта недапушчальна. Юрысты, як і адвакаты, павінны рабіць усё магчымае, каб прадухіліць здзяйсненне неабдуманых учынкаў, бо прафесія юрыста, як і прафесія адваката, мае на мэце аказанне юрыдычнай дапамогі, абарону правоў і законных інтарэсаў грамадзян», — падкрэсліў старшыня калегіі адвакатаў.

БРКА ад імя адвакацкай супольнасці Беларусі чарговы раз заклікае: перш чым здзяйсняць юрыдычна значныя дзеянні, варта звярнуцца да адваката па растлумачэнне магчымых негатыўных наступстваў. «Відавочна, што выпраўляць іх з дапамогай прававых інструментаў нашмат складаней, чым прадухіліць», — дадаў Віктар Чайчыц.

Акрамя таго, ён зрабіў акцэнт на тым, што адвакатура — адзіны прававы інстытут, які мае права на прафесійнай аснове аказваць людзям кваліфікаваную юрыдычную дапамогу ў мэтах абароны іх правоў, свабод і інтарэсаў. «Іншымі словамі, толькі адвакат мае права кансультаваць фізічных асоб на прафесійнай аснове, і толькі ён нясе адказнасць за правільнасць прадстаўленай кансультацыі», — растлумачыў Віктар Чайчыц. Любы чалавек на сайце БРКА можа атрымаць юрыдычную кансультацыю адваката анлайн і бясплатна. Звярнуцца можна і ў любую юрыдычную кансультацыю, адвакацкае бюро, да любога адваката, які працуе індывідуальна.

Старшыня БРКА нагадаў, што ў свой час з дапамогай адвакатуры былі знятыя шматлікія непаразуменні, звязаныя з рэалізацыяй паправак у законы па пытаннях эфектыўнага функцыянавання ваеннай арганізацыі дзяржавы. «Мы звярнуліся ў Мінабароны і прапанавалі пракансультаваць прызыўнікоў. У выніку атрымалася развеяць многія памылкі і, думаю, тым самым утрымаць маладых людзей ад звароту ў сумнеўныя фірмы, якія абяцаюць «адмазаць ад войска», — лічыць старшыня БРКА.

# Перспектывы развіцця

**У сераду, 5 чэрвеня, намеснік старшыні Савета Рэспублікі Анатоль ІСАЧАНКА наведаў з рабочым візітам ААТ «Гарадзейскі цукровы камбінат».**



У рамках візіту віцэ-спікер верхняй палаты парламента сустрэўся з кіраўніцтвам футбольнага клуба «Гарадзея», дзе абмяркоўваліся пытанні перспектыў развіцця дзіцяча-юнацкага спорту ў Нясвіжскім раёне і далейшай дзейнасці футбольнага клуба.

Акрамя таго, Анатоль Ісачанка азнаёміўся з вытворчым працэсам сахарнага камбіната і вывучыў асартымент прадукцыі. Пра перспектывы развіцця цукровай вытворчасці паведаміў дырэктар цукровага камбіната Ігар Макар. Старшыня Нясвіжскага райвыканкама Аляксандр Ломскі расказаў пра сацыяльна-эканамічны стан прадпрыемстваў і ўстаноў раёна.

У гэты дзень віцэ-спікер верхняй палаты парламента таксама наведаў сельгаспрадпрыемства УП «ПІК-Лясное», уласнікам якога ўжо тры гады з'яўляецца ААТ «Гарадзейскі цукровы камбінат».

**Вольга АНУФРЫЕВА.**

# У тым ліку з выездам на месца

**Сенатары практыкуюць розныя формы работы са зваротамі грамадзян. Віцэ-спікер Савета Рэспублікі Анатоль ІСАЧАНКА ў аўторак, 2 чэрвеня, наведаў Барысаў. Такія камандзіроўкі для сенатараў — нармальная практыка.**

— Здараюцца выпадкі, калі разумееш, што трэба выехаць на месца і разабрацца, — растлумачыў намеснік старшыні верхняй палаты парламента мэту свайго візіту ў райцэнтр.

Зварот адной з мясцовых жыхарак — якраз з такой катэгорыі. Яна патэлефанавала на прамую лінію, якую не так даўно праводзіла старшыня Савета Рэспублікі Наталля Качанава, і паскардзілася, што пабудавала памяшканне для печы, але крыху выйшла за межы свайго зямельнага надзела і цяпер не можа ўзаконіць гэтую пабудову.

— Жанчына агучыла свой пункт гледжання. Мы атрымалі дакументы ад Барысаўскага райвыканкама. Трэба было выехаць на месца і паглядзець, што і як можна зрабіць, каб дапамагчы, — адзначыў Анатоль Ісачанка. — У сітуацыі разабраліся. Ва ўсякім выпадку, алгарытм дзеянняў знойдзены, прынятыя адпаведныя рашэнні. Мяркую, пытанне будзе вырашана.

Віцэ-спікер верхняй палаты таксама дадаў, што зямельныя пытанні звычайна з ліку самых складаных і заблытаных, бо маюць даўнішнюю гісторыю. Пры іх вырашэнні важна, каб усе зацікаўленыя бакі мелі на мэце пошук кампраміснага рашэння. Дарэчы, у Барысаве менавіта так і склалася.

Нагадаем таксама, што члены Савета Рэспублікі рэгулярна праводзяць асабістыя прыёмы грамадзян, прамыя тэлефонныя лініі. Напрыклад, у пятніцу, 5 чэрвеня, віцэ-спікер накіруецца ў Беразіно.

— Калі ў людзей будуць пытанні, якія трэба абмеркаваць непасрэдна на месцы, то можна будзе выехаць і паглядзець. Гэта таксама практыкуецца, — рэзюмаваў ён.

**Паводле БелТА.**

# СІЛА — У ГІСТАРЫЧНАЙ МУДРАСЦІ

**Сяргей СІВЕЦ, старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па заканадаўстве і дзяржаўным будаўніцтве:**



— За мінулыя тры дзесяцігоддзі свайго суверэннага развіцця беларускае грамадства выпрацавала імунітэт да гучных лозунгаў і дэкларацый, а ацэнка значнасці той ці іншай палітычнай фігуры даецца толькі на аснове канкрэтных практычных спраў і дасягненняў. Эпоха рэвалюцыйна-папулісцкіх заклікаў — «увесь свет гвалту мы разбурым, а затым...» усіх ашчасцім — даўно адышла ў нябыт.

Значнасць выбару беларусаў у гэтай выбарчай кампаніі шматразова ўзрастае ў святле новых выклікаў і ўзрушэнняў, з якімі сутыкнуўся свет апошнім часам. Ужо відавочны той факт, што ў найбліжэйшай перспектыве нам усім трэба будзе жыць ва ўмовах новага светапарадку, у якім шматлікія геапалітычныя пытанні будуць вырашацца выключна з пазіцыі сілы. Сіла ж беларусаў была і ёсць у іх гістарычнай мудрасці, заснаванай на жаданні захаваць і праз працу прымножыць здабыткі папярэдніх пакаленняў — магчымасці жыць і працаваць у свабоднай, незалежнай, шчаслівай і бяспечнай краіне.

Канстытуцыя, вызначыўшы статус Прэзідэнта ў якасці кіраўніка дзяржавы, адначасова ўсклала на гэтую службовую асобу максімальную персанальную адказнасць за стратэгічнае прагназаванне, забеспячэнне эфектыўнага дзяржкіравання, недапушчэнне або аператыўнае купіраванне крызісных з'яў, што ўзнікаюць, дасягненне грамадскага кампрамісу па найбольш істотных сацыяльных пытаннях. Усё гэта ў сукупнасці вызначае высокі ўзровень інстытуцыянальных патрабаванняў, якім павінен адпавядаць кандыдат на гэтую адказную дзяржаўную пасаду, — нарматыўных, прафесійных, асобасных і светапоглядных.

За 30 гадоў у Беларусі сфарміраваны развітыя палітычная і прававая сістэмы, функцыянуюць інстытуты грамадзянскай супольнасці, развіваецца і забяспечваецца ключавыя палажэнні сацыяльнага кантракта паміж дзяржавай і грамадзянамі. Краіна працягвае дынамічна і паступальна ўмацоўваць нацыянальны каркас дзяржаўнага ладу, выкарыстоўваючы для гэтага сучасны палітычны, эканамічны і сацыяльны інструментарый грамадскага развіцця. Абранне кіраўніка дзяржавы — гэта не проста адзін з дэмакратычных інстытутаў фарміравання сістэмы ўлады, гэта ў першую чаргу ўсвядомлены выбар грамадствам мадэлі свайго развіцця на наступнае пяцігоддзе.

# ТРЭБА КАНСАЛІДАВАЦЦА,

## каб захаваць надзейны падмурак нашага роднага дома, у якім будуць жыць нашы дзеці, унукі і праўнукі

**Дзмітрый ВАРАНЮК, першы сакратар Цэнтральнага камітэта Беларускага рэспубліканскага саюза моладзі, член Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці:**

«Электаральная кампанія ў Беларусі ў самым разгары. Аднак ужо сёння няўзброеным вокам відаць, як для некаторых палітыкаў-пачаткоўцаў такія непахісныя паняцці, як гонар, сумленне, адказнасць і годнасць, сталі разменнай манетай у пагоні за імгненным хайпам. Пакаленне, якое нарадзілася падчас новай эпохі беларускай дзяржаўнасці, вырасла разам са сваёй краінай. Пакуль мы раслі, нашы бацькі закладвалі падмурак і будавалі незалежную суверэнную дзяржаву. Мірная і спакойная маладая Беларусь стала для нас надзейным тылам. Наша краіна захавала духоўныя каштоўнасці і нацыянальную культуру, а мы вучымся вызначаць палітыку дзяржавы, выбудоўваць эканамічную стратэгію і міжнародныя адносіны».



Першы сакратар ЦК БРСМ адзначыў, што галоўная сёлетняя грамадска-палітычная падзея — выбары Прэзідэнта. «Беларусы заўсёды жылі сваім розумам і працай і імкнуліся зрабіць краіну яшчэ лепшай, прыгажэйшай і багацейшай. І сёння надышоў той момант, калі нам трэба кансалідавацца, каб захаваць і не даць разбурыць надзейны падмурак нашага роднага дома, у якім будзем жыць мы з вамі, нашы дзеці, унукі і праўнукі, — падкрэсліў ён. — Аднак мы бачым, што камусьці не падабаецца наша краіна, якая ідзе сваім шляхам. І ўжо рукамі брудных паліттэхнолагаў гэтыя людзі, якія фінансуюць дэстабілізацыю і ў іншых краінах, апрабуюць на вуліцах беларускіх гарадоў усім вядомыя сцэнарыі, накіраваныя толькі на адно — разлад грамадства. Іх задача — каб беларус ненавідзеў беларуса, брат ішоў на брата. Абражаюць і спрабуюць арганізаваць кібербулінг любога, хто адкрыта заяўляе аб адданасці захаванню традыцый Беларусі і выступае за яе развіццё».

Дзмітрый Варанюк дадаў, што ўпэўнены ў годным сённяшнім дні краіны і яе светлым заўтрашнім.

## Не ўсім даспадобы суверэнная і незалежная краіна

**Лілія АНАНІЧ, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі па правах чалавека, нацыянальных адносінах і сродках масавай інфармацыі Палаты прадстаўнікоў:**



— Кампанія па выбарах кіраўніка дзяржавы высвеціла ўвогуле не новую тэму. Далёка не ўсім даспадобы Беларусь, суверэнная і незалежная краіна, дзе сацыяльная справядлівасць, развіццё без майданаў і ўзрушэнняў былі, ёсць і, упэўнена, застануцца найважнейшымі складнікамі далейшага развіцця. Менавіта такі курс ляжыць у аснове поспехаў краіны, яе аўтарытэту і павагі ў свеце. Не заўважаць відавочных дасягненні Беларусі, а тым больш ачарняць пройдзены краінай шлях як мінімум бездакзна.

На жаль, ужо на этапе збору подпісаў бачныя спробы дэстабілізаваць сітуацыю ў краіне любым шляхам, не грэбуючы маніпуляцыямі на эканамічных і эпідэміялагічных цяжкасцях, у тым ліку з актыўным разаграваннем у сацыяльных сетках, вонкавым медыйным уздзеяннем. Асобныя прэтэндэнты ў адкрытую заяўляюць, што іх мэта зусім не выбары, не абмеркаванне шляхоў развіцця краіны, а звяржэнне дзеючай улады. І гэта ў вельмі складаны перыяд, калі ў літаральным сэнсе ўвесь свет змагаецца з выклікамі і пагрозамі, справакаванымі каранавіруснай пандэміяй. На які вынік разлічваюць такія прэтэндэнты? Якую светлую будучыню абяцаюць беларусам? Упэўненая, у нашага народа, які жыве сваім розумам і сваёй працай, хопіць мудрасці годна прайсці выбарчую кампанію, не дапусціць развалу краіны і расколу ў грамадстве.

## Тэндэнцый дэградацыі дапускаць нельга

**Андрэй САВІНЫХ, старшыня Пастаяннай камісіі па міжнародных справах Палаты прадстаўнікоў:**



— Часам узнікае адчуванне, што многія акцыі ў канчатковым выніку адбываюцца пад уплывам знешніх гульцоў, цэнтраў сілы, якія хацелі б паўплываць на ўнутраную і знешнюю палітыку Беларусі ў сваіх інтарэсах. Гэтага не можа дапусціць ні адна дзяржава свету. Таму падобныя спробы ўздзеяння па зразумелых прычынах будуць, безумоўна, спыняцца.

Беларусь — маладая дзяржава, хоць і з вялікай гісторыяй, і многія дзяржаўныя, у тым ліку дэмакратычныя, грамадскія традыцыі ў краіне фарміруюцца цяпер. Іх гісторыя налічвае не больш за 30 гадоў. Фарміраванне такіх грамадскіх традыцый патрабуе часу і магчыма толькі ў тым выпадку, калі ўсе ўдзельнікі гэтага працэсу паводзяць сябе карэктна і працуюць на кансалідацыю, а не на раз'яднанне грамадства.

Калі гэтая ўмова не выконваецца, то ўзнікае велізарная колькасць беззмястоўных канфліктаў, і ў канчатковым выніку пазітыўнага развіцця не адбываецца. Хутчэй наадварот, грамадства дэградуе ў сваёй здольнасці працаваць разам у інтарэсах краіны ў цэлым. Гэтых тэндэнцый ні ў якім разе дапускаць нельга.

**Матэрыялы падрыхтаваны паводле БелТА.**

# Беларуская эканамічная мадэль працуе

**Алег ДЗЯЧЭНКА, член Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці, прарэктар Магілёўскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя А. Куляшова:**



— Адзін з прэтэндэнтаў у кіраўнікі нашай дзяржавы ў сваім нядаўнім інтэрв'ю расійскаму выданню абмовіўся пра тое, што беларуская эканоміка «знаходзіцца ў перадсмяротным стане», але адразу ж удакладніў: «Наконт глыбокага эканамічнага крызісу я б не сказаў». Яно і зразумела — навошта адмаўляць відавочнае. За апошнія дзесяцігоддзі толькі лянівы не хаваў беларускую эканоміку. Яе крытыкавалі практычна ўсе — ад хатніх гаспадынь і інтэлігентаў-іншадумцаў да журналістаў і дыпламаваных эканамістаў. У перыяды сусветных эканамічных крызісаў, што закранаюць і асобныя сегменты нацыянальнай эканомікі, вострыя дыскусіі разгортваліся ў прэсе, у кулуарах улады, у віртуальнай прасторы. Складвалася ўражанне, што яшчэ крыху і ўсё — настане апакаліптычны калапс, паўторыцца эканамічны кашмар, які нам добра знаёмы па 1980—1990-х гадах.

Аднак эканамічныя спады змяняліся эканамічнымі ўздымамі; згасалі палітычныя страсці і эканамічныя спрэчкі; раствараліся на бязмежных прасторах грамадска-палітычнага жыцця ўчарашнія прэтэндэнты на найвышэйшую дзяржаўную ўладу. Пра «васількова», «джынсавыя» ды іншыя рэвалюцыі ў памяці заставаліся адны толькі ўспаміны, а «пахаванне» беларускай мадэлі шматукладнай эканомікі адкладвалася палітычнымі футуролагамі на будучую пяцігодку. Можна колькі заўгодна фантазіраваць на тэму «смяротнасці» нашай эканамічнай мадэлі і ладзіць бутафорскія «пахавальныя працэсіі». Занятак гэты няўдзячны і бессэнсоўны, бо беларуская эканамічная мадэль працуе. Гэта галоўнае. І гэта — бясспрэчны факт. Для прыкладу вазьму толькі адзін з кірункаў эканамічнага развіцця магілёўскага рэгіёна — знешнеэканамічную дзейнасць прадпрыемстваў і ўстаноў.

Але спачатку пра геаграфію. Магілёўшчына развівае гандлёвыя сувязі са 114 дзяржавамі свету, у якія ажыццяўляецца экспарт тавараў і паслуг на мільярды амерыканскіх долараў. Мы прадаём за мяжу шыны, мэблю, ліфты і абсталяванне, чыгуначныя вагоны, сінтэтычныя валокны, мясамалочныя і іншыя прадукты.

Прывяду адзін цікавы выпадак. У 2018 годзе ва Універсітэце Дэнісана (штат Агая, ЗША) за кубкам гарбаты з амерыканскімі калегамі абмяркоўвалі пытанне неабходнасці адмены санкцый супраць беларускіх прадпрыемстваў. І я са здзіўленнем убачыў на стале нашы беларускія «дамачаўскія» пернікі, імпартаваныя ў ЗША кампаніяй Euphoria Fancy Food Inc. Дробязь, скажаце вы, — але ж прыемна.

Магілёўшчына экспартуе не толькі прамысловую прадукцыю. Сёння актыўна развіваецца экспарт камп'ютарных, будаўнічых, інжынерных і турыстычных паслуг, паслуг у галіне культуры і адпачынку, адукацыі і аховы здароўя. Мы крок за крокам асвойваем рынкі Расіі і Еўропы, рухаемся ў краіны Афрыкі, Лацінскай Амерыкі і Блізкага Усходу.

Таму дазвольце не пагадзіцца з меркаваннем, нібыта наша эканоміка нежыццяздольная ды шкодная. Як вядома, крытэрый ісціны — практыка, а практыка даказвае, што нават ва ўмовах глыбокіх эканамічных крызісаў беларуская эканамічная мадэль мае надзвычайную ўстойлівасць і здольнасць эвалюцыянаваць.

# Ад чыстай зямлі да чыстай планеты

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)*

— Работа па навядзенні парадку шматпланавая: гэта і азеляненне тэрыторый, і знос састарэлых пустуючых дамоў, і ўцягванне вызваленых зямель у гаспадарчы абарот, і догляд грамадзянскіх і воінскіх пахаванняў, — кажа **начальнік галоўнага ўпраўлення экалагічнай палітыкі, міжнароднага супрацоўніцтва і навукі Мінпрыроды Таццяна КАНАНЧУК.** — З удзелам грамадскасці праводзяцца ў парадак засмечаныя раней тэрыторыі, збіраецца смецце ў ахоўнай зоне рэк і азёр, праводзяцца суботнікі па азеляненні і іншыя акцыі ў рамках кампаніі «Добраўпарадкуем малую радзіму». Важную ролю ў гэтым працэсе адыгрываюць дэпутаты мясцовых Саветаў — яны не проста ўдзельнікі, а разам з тэрытарыяльнымі органамі Мінпрыроды галоўныя дзеючыя асобы.

Дзякуючы пастаяннаму кантакту з насельніцтвам праз сходы, прыёмы грамадзян дэпутаты ведаюць асноўныя праблемы ў сваіх рэгіёнах і могуць паспрыяць іх вырашэнню. Напрыклад, за сродкі Саветаў і органаў тэрытарыяльнага самакіравання праводзіцца добраўпарадкаванне дваровых тэрыторый, ствараюцца спартыўныя пляцоўкі, месцы для адпачынку, да гэтай работы прыцягваюцца і мясцовыя жыхары.

Па словах спецыяліста, мясцовай уладзе трэба больш абмяркоўваць з насельніцтвам актуальныя праблемы, разам шукаць шляхі іх вырашэння — ад арганізацыі збору смецця да рэалізацыі мясцовых ініцыятыў.

У апошнія гады значная ўвага ў краіне звяртаецца на развіццё экалагічнага турызму. Саветы дэпутатаў разам з органамі тэрытарыяльнага самакіравання ствараюць ініцыятыўныя групы, бяруць удзел у розных конкурсах па прыцягненні сродкаў міжнародный тэхнічнай дапамогі. Так, у парадак прыводзяцца мясцовыя крыніцы ці вадасховішчы, а затым гэтыя аб'екты ўключаюцца ў экалагічныя маршруты раёна.

— Калі я была дэпутатам Нацыянальнага сходу па Быхаўскай выбарчай акрузе, была відавочцам рэалізацыі многіх падобных праектаў у Быхаўскім, Краснапольскім, Касцюковіцкім, Слаўгарадскім раёнах, — кажа Таццяна Кананчук. — І цяпер на асабліва ахоўных прыродных тэрыторыях, дзе гэта магчыма, працягвае стварацца інфраструктура. Гэта не толькі дапамагае прыцягваць экатурыстаў, але спрыяе сацыяльна-эканамічнаму развіццю тэрыторый.

## Схема — усяму галава

Непасрэдна на мясцовым узроўні вырашаецца і пытанне абыходжання з цвёрдымі камунальнымі адходамі. Так, на працягу некалькіх гадоў у краіне вядзецца работа па скарачэнні колькасці аб'ектаў захавання адходаў, якія не адпавядаюць сучасным патрабаванням бяспекі. З 2016 года колькасць міні-палігонаў дзякуючы іх закрыццю і рэкультывацыі скарацілася ў тры разы (з 1750 да 556). У эксплуатацыі таксама знаходзіцца 159 палігонаў ЦКА. Да 2022 года плануецца закрыць усе міні-палігоны. Іх месца зоймуць аб'екты па сартаванні і выкарыстанні цвёрдых камунальных адходаў і сучасныя палігоны для іх захавання.

Але закрыццё міні-палігона, на жаль, не заўсёды праходзіць гладка, у тым ліку для прыроды. Добра ілюструюць сітуацыю несанкцыянаваныя звалкі, якія часам з'яўляюцца ў мясцовых лясах і хмызняках, уздоўж дарог і на прыпынках грамадскага транспарту. Так, за першы квартал 2020 года ў краіне зафіксавана 5038 фактаў размяшчэння адходаў па-за санкцыянаванымі месцамі. Да адказнасці прыцягнута 138 юрыдычных і 271 фізічных асоб на агульную суму штрафаў 135 691 рубель.

**У краіне налічваецца 4615,7 гектара зямель, занятых баршчэўнікам Сасноўскага. Менш за ўсё гэтай расліны ў Брэсцкай вобласці (12,99 гектара), больш за ўсё — на Віцебшчыне (3974,4 гектара). Меншыя плошчы і іншыя фактары дапамаглі паўднёва-заходняму рэгіёну краіны і Мінску перавыканаць планы па апрацоўцы гэтых плошчаў, у адрозненне ад паўночнай часткі краіны. Усяго ж, паводле звестак на канец мая, мерапрыемствы па рэгуляванні праведзены на тэрыторыі 1988,3 гектара (59,5 % ад плана).**

Калі ў рэгіёне шмат несанкцыянаваных звалак — значыць, дрэнна працуе схема абыходжання з адходамі, лічаць у Мінпрыроды.

— Мясцовыя органы ўлады, Саветы дэпутатаў сумесна з органамі тэрытарыяльнага грамадскага самакіравання павінны своечасова ініцыяваць унясенне змен у адпаведныя дакументы, — упэўнена Таццяна Кананчук. — Гэтае пытанне трэба абмяркоўваць з людзьмі на сходах, праз старастаў, старэйшын і іншых — каб кожны жыхар ведаў, якія змены будуць уносіцца; працаваць разам з арганізацыямі ЖКГ, тэрытарыяльнымі органамі Мінпрыроды.

**За першы квартал 2020 года тэрытарыяльныя органы Мінпрыроды выявілі 676 парушэнняў выканання схем абыходжання з камунальнымі адходамі. Да адказнасці прыцягнута 4 юрыдычныя, 6 службовых і 5 фізічных асоб на суму 3604,5 рубля.**

Так, яшчэ да запланаванага закрыцця міні-палігона трэба вызначыць, як будзе арганізаваны збор смецця: магчыма, варта паставіць дадатковыя кантэйнеры, у тым ліку для другасных матэрыяльных рэсурсаў, ці часцей вывозіць адходы.

— Калі ў населеных пунктах схемы добра не працавалі, то ў некаторых садаводчых таварыствах і гаражных кааператывах з-за адсутнасці праўленняў схемы наогул не распрацоўваліся. Адпаведна, належным чынам не быў арганізаваны збор і вываз адходаў, — лічыць **начальнік галоўнага ўпраўлення абыходжання з адходамі, біялагічнай і ландшафтнай разнастайнасці Мінпрыроды Вольга САЗОНАВА.** — Дзякуючы зменам у Закон «Аб абыходжанні з адходамі» цяпер парадак абыходжання з адходамі, якія ўтвараюцца ў гэтых структурах, уключаецца ў схемы абыходжання з ЦКА, што распрацоўваюцца і зацвярджаюцца мясцовымі органамі ўлады. Паколькі дачны сезон толькі пачаўся, эфектыўнасць гэтых змен мы зможам убачыць у найбліжэйшы час.

Каб вырашыць гэтыя і іншыя праблемы, звязаныя з арганізацыяй сістэмы збору і вывазу камунальных адходаў, Мінжылкамгасам распрацоўваецца ТКП «Ахова навакольнага асяроддзя і прыродакарыстанне. Адходы. Правілы абыходжання з камунальнымі адходамі». Па словах Вольгі Сазонавай, у дакуменце плануецца замацаваць агульныя правілы — як увогуле наконт сістэмы абыходжання з ЦКА, так і канкрэтныя патрабаванні па колькасці кантэйнераў, маркіроўцы і г. д. Усе яны будуць абавязковыя да выканання. Цяпер дакумент дапрацоўваецца з улікам правак Мінпрыроды.

> «Да 2022 года плануецца закрыць усе міні-палігоны. Іх месца зоймуць аб'екты па сартаванні і выкарыстанні цвёрдых камунальных адходаў і сучасныя палігоны для іх захавання.

## Гаспадарлівасць выратуе ад інвазій

Распаўсюджванне інвазійных раслін — яшчэ адна праблема, якую немагчыма вырашыць без узаемадзеяння мясцовых улад, насельніцтва і землекарыстальнікаў.

Штогод да 15 красавіка мясцовыя выканаўчыя і распарадчыя органы зацвярджаюць раённыя планы мерапрыемстваў па рэгуляванні распаўсюджвання і колькасці інвазійных відаў раслін. Папярэдне спецыялісты вывучаюць, ці з'явіліся на іх тэрыторыі новыя месцы, ацэньваюць, наколькі эфектыўна былі апрацаваны раней выяўленыя папуляцыі. Пры гэтым асноўныя мерапрыемствы па рэгуляванні распаўсюджвання і колькасці інвазійных раслін павінны праводзіць карыстальнікі зямельных участкаў.

На асаблівым кантролі знаходзяцца папуляцыі сумніку канадскага і баршчэўніку Сасноўскага.

— З раней выяўленымі папуляцыямі атрымалася дасягнуць пэўных вынікаў, у тым ліку з дапамогай шырокай хімічнай апрацоўкі, — адзначыла Вольга Сазонава. — З імі на працягу двух-трох гадоў вядзецца работа, многія з іх былі ліквідаваныя. Але за кошт таго, што ў пачатку 2019 года прайшла шырокая кампанія па выяўленні новых месцаў, плошча, дзе зафіксаваныя інвазійныя расліны, значна ўзрасла.

**На 1 студзеня 2020 года сумнік канадскі займаў 2863,29 гектара тэрыторыі Беларусі. Найлепшая сітуацыя з гэтай раслінай у Гомельскай (25,63 гектара) і Брэсцкай (54,84 гектара) абласцях, найгоршая — у Мінскай (679,25 гектара) і Гродзенскай (1141,41 гектара).**

Але знішчэнне інвазійных раслін — толькі першы крок. Вельмі важна пасля правядзення работ уцягнуць вызваленыя землі ў гаспадарчы абарот — засеяць іх living рознымі травасумесямі, правесці лесаразвядзенне ці пачаць выкарыстоўваць у сельскай гаспадарцы. У адваротным выпадку шкодныя расліны зноў могуць з'явіцца там праз нейкі час.

Па словах Таццяны Кананчук, акрамя вялікіх тэрыторый, важна звяртаць увагу і на кветнікі мясцовых жыхароў, адкуль часта распаўсюджваюцца ў прыроду інвазійныя расліны. Мясцовыя органы ўлады і Саветы дэпутатаў у рамках навядзення парадку на зямлі праводзяць шырокую растлумачальную работу з насельніцтвам, чаму нельга вырошчваць сумнік і іншыя шкодныя расліны.

Каб барацьба з інвазіямі была больш сістэмная, у краіне распрацоўваецца ТКП «Ахова навакольнага асяроддзя і прыродакарыстанне. Раслінны свет. Патрабаванні да правядзення работ па абмежаванні распаўсюджвання і колькасці інвазійных раслін (баршчэўніку Сасноўскага, сумніку канадскага, эхінацысцісу лопасцевага і іншых) рознымі метадамі».

— ТКП будзе ўтрымліваць патрабаванні да правядзення работ па абмежаванні распаўсюджвання і колькасці інвазійных раслін, тэхналогіі, самі мерапрыемствы па рэгуляванні і прафілактыцы і, галоўнае, — ацэнку эфектыўнасці такіх мерапрыемстваў, — падсумоўвае Вольга Сазонава. — Мяркуецца, што сёлета дакумент будзе ўведзены ў дзеянне.

**Вераніка КОЛАСАВА,**
**фота аўтара.**



## ПАРАДАК НА ЗЯМЛІ Ў ЛІЧБАХ

У рамках Рэспубліканскага плана мерапрыемстваў па навядзенні парадку на зямлі за чатыры месяцы 2020 года ў краіне:

- у населеных пунктах і на тэрыторыях уздоўж аўтамабільных дарог высаджана 215 тысяч дрэў і 99 тысяч кустоў (план — 48 067 і 21 648 адпаведна);
- усталявана і адрамантавана 7655 кантэйнераў для збору адходаў (план — 3750), у тым ліку 4315 — для паасобнага збору (план — 3142);
- знесены 931 пустуючы і састарэлы жылы дом (план — 420);
- узарана і ўцягнута ў гаспадарчы абарот 2387 гектараў пустуючых сельскагаспадарчых зямель;
- праведзены ліквідацыйны тампанаж 41 свідравіны, якія не выкарыстоўваліся (план — 3);
- рэкультываваны 42 выведзеныя з эксплуатацыі міні-палігоны (план — 12) і 54 адпрацаваныя ўнутрыгаспадарчыя кар'еры (план — 11);
- на ААПТ устаноўлены 171 інфармацыйны знак (план — 118), добраўпарадкаваныя існуючыя зоны і месцы адпачынку, турыстычныя стаянкі ў нацыянальных парках і заказніках, устаноўлены 121 кантэйнер для збору адходаў (план — 23) і іншае.

**Таццяна КАНАНЧУК, начальнік галоўнага ўпраўлення экалагічнай палітыкі, міжнароднага супрацоўніцтва і навукі Мінпрыроды:**

— Мясцовыя выканкамы, дэпутаты мясцовых Саветаў — важнае звяно ў працэсе ўдасканалення прыродаахоўнага заканадаўства. Яны першыя сутыкаюцца з недахопамі і прабеламі пры практычнай рэалізацыі заканадаўчых актаў, таму могуць указаць на іх у сваіх штогадовых справаздачах аб забеспячэнні жыццядзейнасці насельніцтва.

Менавіта яны праводзяць вялікую практычную работу, у тым ліку растлумачальную — з насельніцтвам, на карысць прыродзе і для развіцця беларускіх тэрыторый.

У Дзень аховы навакольнага асяроддзя я хачу павіншаваць з гэтым святам усіх, хто звязаны з рэалізацыяй экалагічнай палітыкі краіны, і падзякаваць за значны ўнёсак у справу аховы прыроды.

**У 2019—2020 гадах у рэгіёнах краіны прадугледжана стварэнне аб'ектаў па кампаставанні арганічнай часткі ЦКА. Гэта паспрыяе вырашэнню праблемы, калі ў кантэйнеры і, адпаведна, на палігоны трапляюць раслінныя адходы, якія могуць выкарыстоўвацца ў гаспадарцы.**

# Спытайце ў янота



На канале АНТ працягваецца цыкл навукова-папулярных дакументальных фільмаў «Мэта 99. Дом без адходаў» — гэта першы ў нашай краіне праект на тэму адходаў, зняты адмыслова на замову дзяржустановы «Аператар другасных матэрыяльных рэсурсаў» Міністэрства жыллёва-камунальнай гаспадаркі Беларусі. Новыя серыі цыкла выходзяць на АНТ раніцай у 8.30 па суботах.

Куды выкідваць цюбік ад зубной пасты? Як на самай справе правільна сартаваць смецце, і што гэта дае на лакальным і глабальным узроўнях? Як хлам звязаны з прагрэсам і што адбываецца са смеццем пасля таго, як мы яго выкінулі? На ўсе актуальныя пытанні адказваюць спецыялісты — кіраўнікі міністэрстваў і прафільных прадпрыемстваў, перапрацоўшчыкі і эколагі. Акрамя таго, у кожнай з 10 серый праекта з'яўляецца ўнікальны персанаж — Янот, які паказвае збоку пачуадзённыя звычкі беларусаў у абыходжанні са смеццем і тое, да чаго яны могуць прывесці ў перспектыве.

**Вікторыя ЗАХАРАВА.**

# Беларускае кіно на «Культуры»

На наступным тыдні ў эфіры тэлеканала гледачоў чакае паказ двух фільмаў айчыннай вытворчасці.

8 чэрвеня прыхільнікам мастацкага кіно прапануецца кінастужка Віктара Турава «Я родам з дзяцінства» (Беларусьфільм, 1966), што апавядае пра пакаленне хлопцаў, якім давялося перажыць Вялікую Айчынную вайну, дачакацца Перамогі і ўвайсці ў дарослае жыццё з вопытам страты блізкіх і з надзеяй на шчаслівую будучыню. Фільм быў адзначаны на Кінафестывалі рэспублік Прыбалтыкі, Беларусі і Малдавіі ў 1967 годзе прэміямі «За найлепшую рэжысёрскую работу» і «За найлепшую жаночую ролю» (Ніна Ургант). Дарэчы, гэта адзін з тых твораў кінематографа, у акцёрскі склад якога ўвайшоў Уладзімір Высоцкі, а ў самой карціне гучаць яго песні.

А 12 чэрвеня ранішні эфір «Культуры» адкрые мастацкі фільм «Маё каханне», зняты ў 1940 годзе рэжысёрам Уладзімірам Коршам-Сабліным. Кінастужка апавядае гісторыю кахання маладых людзей, якая складаецца, нібы пазл, насуперак усім жыццёвым абставінам, бо менавіта ўменне застацца побач з каханым чалавекам у складанай сітуацыі і ёсць адзін з тых крытэрыяў, якія дапамагаюць галоўнай гераіні зразумець, хто ёсць хто на самай справе.

**Алена ДРАПКО.**

# ШАШКІ «Звязда» Выпуск № 115

Для самастойнага рашэння прапануюцца кампазіцыі замежных аўтараў. Першыя дзве склаў Генадзь Андрэеў (Рыга)

№ 53



№ 53

**Белыя простыя шашкі:** c1, d2, f2, h2, g3, f4, g5 (7)

Летась падчас абследавання палігонаў «Трасцянецкі» і «Прудзішчы» камітэт знайшоў парушэнні пры захоўванні тут ДМР. Вінаватых асоб аштрафавалі больш чым на сем тысяч рублёў, а палігон «Прудзішчы» вывелі з эксплуатацыі. Камітэт таксама выдаў рэкамендацыі адносна эксплуатацыі палігона «Трасцянецкі», выкананне якіх запланавана на гэты год.



— За кошт павелічэння аб'ёмаў нарыхтоўкі асноўных відаў другаснай сыравіны летась выкарыстанне цвёрдых камунальных адходаў (ЦКА) склала 25,7 % ад утвораных, — паведаміў Сцяпан Дубніцкі. — Па выніках 2018-га паказчык вымання ДМР з ЦКА быў 14,7 %.

Каб не дапусціць забруджвання асяроддзя ўстойлівымі злучэннямі поліхлараваных біфенілаў (ПХБ), камітэт летась ажыццявіў 25 выбарачных праверак і 35 маніторынгаў суб'ектаў гаспадарання, якія працуюць з такімі адходамі. За 2016—2019 гады ў Мінску выведзены з эксплуатацыі 4603 адзінкі абсталявання, якое ўтрымлівае ПХБ. Гэта 73,6 % ад узроўню наяўнасці такога абсталявання ў 2015-м. У 2021 годзе па ўсёй краіне трэба вывесці з ужытку 50 % такога абсталявання ў параўнанні з лічбамі 2015-га.

## Ровар і самакат супраць аўто

Летась аб'ём выкідаў забруджваючых рэчываў у атмасферу застаўся на ўзроўні мінулых гадоў — 18,3 тысячы тон. А мадэрнізацыя вытворчых працэсаў, змяненне сыравіны і матэрыялаў, якія ўжываюцца, і пераход на выкарыстанне водарастваральных фарбаў дазволілі знізіць выкіды арганічных лятучых злучэнняў у паветра і павысіць эфектыўнасць газачыстага абсталявання, паведаміў старшыня камітэта. Тым не менш Заводскі, Фрунзенскі і Партызанскі — раёны з найбольшай эмісіяй, а больш за 80 % выкідаў ствараюць мабільныя крыніцы — транспарт. Летась яны спрадукавалі 130,1 тысячы тон выкідаў. Аднак гэта на 5,5 тысячы менш, чым у 2018-м.

— Скарачэнне выкідаў абумоўлена абнаўленнем парка аўтатэхнікі, аптымізацыяй арганізацыі дарожнага руху, большым выкарыстаннем грамадскага транспарта замест асабістага. А таксама — павышэннем якасці маторнага паліва, пераводам асабістых аўто на работу на кампрыміраваным звадкаваным газе і развіццём сеткі электробусаў, — растлумачыў Сцяпан Дубніцкі.

Усё больш папулярнымі становяцца ровары, многія перайшлі на самакаты. З вясны ў пракаце з'явіліся электраровары.

## Зоны рэкрэацыі і батанічныя помнікі

Сталіца можа пахваліцца не толькі мерапрыемствамі па ахове экалогіі, але і выдатнымі помнікамі расліннага і жывёльнага свету.

За экалагічнай абстаноўкай у горадзе сочаць на пунктах назіранняў маніторынгу атмасфернага паветра ў прамысловых раёнах Мінска: на праспекце Незалежнасці і вуліцах Ціміразева, Каржанеўскага, Радыяльнай, Герояў 120-й дывізіі.

Яшчэ ў 2016-м зацверджаны мерапрыемствы па аздараўленні ракі Свіслач, яе прытокаў і прылеглай тэрыторыі. Яны прадугледжваюць стварэнне ачышчальных збудаванняў паверхневых сцёкавых вод, умацаванне берагавой лініі, уладкаванне ў прыбярэжнай зоне вела- і экасцежак, месцаў для рэкрэацыі і турызму. Гідрахімічны статус Свіслачы ацэньваецца як выдатны і добры.

На тэрыторыі горада існуе чатыры асабліва ахоўныя прыродныя тэрыторыі. Гэта батанічны сад, парк камянёў, заказнікі Лябяжы і Сціклева. У 2017-м у Мінску з'явілася восем батанічных помнікаў прыроды мясцовага значэння: дубова-ліпавы масіў «Белая дача» з дрэвамі ўзростам 100—120 гадоў, «Векавая алея» і «Векавая дуброва» парка «Курасоўшчына», «Клёны Аляксандраўскага сквера» — два дрэвы, якім каля 140 гадоў, «Ясень Аляксандраўскага сквера», пасаджаны прыкладна ў сярэдзіне XIX стагоддзя, «Ліпа Губернатарскага саду», «Таполя-велікан», «Векавы дуб» у парку Горкага.

У сталіцы можна знайсці 35 відаў рэдкіх раслін і дзікіх жывёл, якія занесены ў Чырвоную кнігу. Створана 11 экасцежак, найбольш папулярныя з якіх — «Горад птушак», «Каменная горка» і «Чыжоўка».

**Ірына СІДАРОК, фота аўтара.**

МІЖНАРОДНАЕ СУПРАЦОЎНІЦТВА

# ЗНІШЧЫЦЬ ШКОДНЫЯ АДХОДЫ

**НА тэрыторыі многіх прадпрыемстваў і сельгасарганізацый па сёння захоўваюцца асабліва шкодныя адходы, якія могуць істотна забрудзіць наваколле і пагоршыць здароўе людзей. Як вырашыць гэту праблему?**

Стойкія арганічныя забруджвальнікі (САЗ) — гэта група хімічных рэчываў, вельмі ўстойлівых да натуральнага распаду. Акрамя доўгага тэрміну існавання, яны характарызуюцца вельмі высокай таксічнасцю і здольнасцю назапашвацца ў жывых арганізмах.

На тэрыторыі нашай краіны, як напамін пра СССР, назапашана вялікая колькасць САЗ — у выглядзе састарэлага абсталявання (сілавых кандэнсатараў і трансфарматараў), якое ўтрымлівае поліхлараваныя біфенілы (ПХБ), і непрыдатных, забароненых да выкарыстання пестыцыдаў. Па падліках спецыялістаў, апошніх у Беларусі знаходзіцца больш за 10 тысяч тон. Каля 15 % з іх захоўваецца на тэрыторыі сельгаспрадпрыемстваў і райаграсэрвісаў, 44 % — на КУП «Комплекс па перапрацоўцы і захаванні таксічных прамысловых адходаў Гомельскай вобласці», 41 % — у падземных сховішчах. Агульная колькасць выяўленых ПХБ-утрымліваючых кандэнсатараў — каля 35 тысяч адзінак, трансфарматараў — 252 адзінкі з агульным утрыманнем ПХБ больш за тысячу тон.

**Больш за ўсё непрыдатных пестыцыдаў сёння захоўваецца ў Гомельскай вобласці (7290,711 тоны) і ў Віцебскай вобласці — 1520,393 тоны. Менш за ўсё іх на Брэстчыне — 6,061 тоны.**

Як бок Стакгольмскай канвенцыі аб стойкіх арганічных забруджвальніках (з 2004 года) Рэспубліка Беларусь згодна з узятымі на сябе абавязацельствамі павінна да 2025 года завяршыць эксплуатацыю ўсяго абсталявання, што ўтрымлівае ПХБ, а да 2028 года — цалкам ачысціць ад гэтых рэчываў сваю тэрыторыю.

Як расказала **начальнік галоўнага ўпраўлення рэгулявання абыходжання з адходамі, біялагічнай і ландшафтнай разнастайнасці Мінпрыроды Вольга САЗОНАВА**, для гэтага Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя рэалізуе два праекты міжнароднай тэхнічнай дапамогі на агульную суму больш за 12 мільёнаў долараў ЗША.

У рамках праекта «Устойлівае кіраванне стойкімі арганічнымі забруджвальнікамі і хімічнымі рэчывамі ў Беларусі» ГЭФ-6 прадугледжваецца экалагічна бяспечнае знішчэнне 2370 тон ПХБ-утрымліваючых адходаў, якія захоўваюцца на тэрыторыі прадпрыемстваў-уласнікаў (каля 60 % ад агульнай колькасці), і 1900 тон шкодных пестыцыдаў. Будуць ліквідаваны ўсе склады такіх пестыцыдаў, якія належаць сельгаспрадпрыемствам, а самі рэчывы — абясшкоджаны. Плануецца таксама дэтальна абследаваць пяць падземных сховішчаў непрыдатных пестыцыдаў.




У рамках праекта ЮНІДО «Узгодненае кіраванне ўтылізацыяй азонаразбуральных рэчываў і стойкіх арганічных забруджвальнікаў у Беларусі, Украіне, Казахстане і Арменіі» на тэрыторыі комплекса па перапрацоўцы і захаванні таксічных прамысловых адходаў Гомельскай вобласці ствараецца прадпрыемства па экалагічна бяспечным абясшкоджванні і перапрацоўцы непрыдатных пестыцыдаў і іншых небяспечных адходаў у аб'ёме да дзвюх тысяч тон у год.

**Настасся АЛЯКСЕЕВА.**

# ЭНЕРГЕТЫЧНАЯ РЭІНКАРНАЦЫЯ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1–й стар. «МС».)*

Сучасная Добрушская міні-ГЭС з'явілася практычна на тым жа месцы, дзе працавала яе папярэдніца. Плюсы новай крыніцы «зялёнай» энергіі вядомыя: не патрабуе выкапнёвага паліва, не забруджвае навакольнае асяроддзе, не шкодзіць насельнікам ракі: рыба можа свабодна праходзіць праз турбіны.

> Для Беларусі з яе водным багаццем гэта тэхнічна даступны сёння рэсурс, аднак выкарыстаны ён пакуль менш чым на 10 %.



Прадпрыемства — аб'ект інвестыцыйнага праекта, што рэалізаваны таварыствам «ДобГідраІнвест». Яшчэ ў 2016 годзе яно заключыла інвестдагавор з Гомельскім аблвыканкамам аб будаўніцтве міні-ГЭС на рацэ Іпуць. Заяўлены аб'ём інвестыцый тады быў каля мільёна долараў ЗША. Праектная магутнасць гідраэлектрастанцыі ацэньвалася ў 700 кВт/г, аднак пазней праект падкарэкціравалі і магутнасць турбін паменшылі.

Цяпер міні-ГЭС на Іпуці — трэцяя, што дзейнічае ў Беларусі, і першая — у Гомельскай вобласці. Такая невялікая колькасць тлумачыцца тым, што для работы падобных станцый неабходны перапад вады, але амаль усе рэкі ў нашай краіне роўныя. Неспрыяльным для работы гідраэнергетыкі лічыцца высокі ўзровень вады ў паводку ці наадварот — адсутнасць вады праз засуху, што больш актуальна ў апошнія гады.

— Дзесяць месяцаў у годзе ГЭС павінна працаваць. Але пры паводкавай сітуацыі электрастанцыя проста фізічна гэтага не зможа, прытым мінімальны ўзровень вады — 140 сантыметраў. Такі павінен быць перапад у гэтай рэчцы, — тлумачыць **намеснік дырэктара ТАА «ДобГідраІнвест» Аляксандр ПАХОМАЎ.** — У адваротным выпадку электраэнергія выпрацоўвацца не будзе. Напрыклад, электрастанцыя павінна выпрацоўваць 450 кВт/г, але ў анамальны год, такі як гэты, яна выпрацоўвае 300 — заканамерна, бо доўга не было дажджоў, зімой не было снегу. Вось пайшлі дажджы — бачым пад'ём па выпрацоўцы энергіі і перадачы яе ў сетку.

Добрушская міні-ГЭС працуе ў аўтаматычным рэжыме і дыстанцыйна кіруецца апаратамі з Віцебска. Дзяжурныя супрацоўнікі на месцы патрэбны на выпадак непрадбачаных сітуацый. Асноўнае абсталяванне выраблена ў КНР. Станцыя працуе ўсяго на тры турбіны, пры гэтым яна не самая маленькая сярод гідраэлектрастанцый Беларусі. Як усе айчынныя ГЭС, Добрушская станцыя нізканапорная, што абумоўлена раўніннай тэрыторыяй рэчышча.

Пусканаладачныя работы на аб'екце доўжыліся каля месяца. У выніку жыхары райцэнтра атрымалі і новыя рабочыя месцы.

— Праблем не было, але наладка праграмнага забеспячэння, аўтаматычнага кіравання, сам запуск, будаўнічыя работы — усё гэта было нялёгка, — расказвае **галоўны энергетык ТАА «ДобГідраІнвест» Генадзь БЕЛЯНКОЎ.** — Мы нават працавалі да дзевяці—дзесяці вечара, бо трэба было ўводзіць аб'ект у эксплуатацыю, вось гэта было складана. А цяпер усё проста.

Галоўны энергетык засяроджвае ўвагу на нюансах работы станцыі:

— Спачатку вада паступае на лопасці турбіны, яна раскручваецца, далей праз падшыпнікавы вузел паступае на рэдуктар, пасля ідзе на генератар. Ён выпрацоўвае электрычны ток. У нас тры машыны, кожная разлічана на 150 кВт/г.

Што датычыцца магчымасцяў Добрушскай міні-ГЭС, то за гадзіну тут можна атрымаць 450 кілават электраэнергіі, якая потым пастаўляецца ў агульную сетку прадпрыемства «Гомельэнерга». Планаваная штогадовая выпрацоўка электрычнай энергіі на міні-ГЭС складае 2,4 мільёна кВт/г. Разліковы тэрмін акупнасці інвест-праекта — 5—7 гадоў.

Цяпер станцыя працуе ў штатным рэжыме. Праўда, пакуль толькі на 70 %.

Між тым попыт на чыстую энергію павышаецца. Напрыклад, толькі з Добрушскай міні-ГЭС кантракты на пастаўку энергіі заключаны ўжо на 10 гадоў наперад. Гэта пры тым, што да нядаўняга часу ў рэгіёне ўвогуле не было магчымасці задзейнічаць патэнцыял ветра- і гідраэнергетыкі.

> З Добрушскай міні-ГЭС кантракты на пастаўку энергіі заключаны ўжо на 10 гадоў наперад.

Наогул укладаць сродкі ў «зялёную» энергетыку цяпер сусветная тэндэнцыя. Для Беларусі з яе водным багаццем шлях больш чым перспектыўны. Паводле ацэнак навукоўцаў, беларускія рэкі маглі б забяспечыць вытворчасць не менш чым 250 мегават электраэнергіі. Гэта тэхнічна даступны сёння рэсурс, аднак выкарыстаны ён пакуль менш чым на 10 %.

**Наталля КАПРЫЛЕНКА.**

ЦІКАВАЕ ПЫТАННЕ

# Чужынец супраць абарыгенаў! Хто каго?

## або Як на Міншчыне змагаюцца з сумнікам канадскім



**Кожны з нас неаднаразова заўважаў у розных месцах Беларусі кусты з жоўтымі кветкамі, якія нагадваюць мяцёлкі. Гэта — сумнік канадскі (далей — сумнік). Калісьці ім упрыгожвалі могілкі, клумбы, агароды. У той час ніхто не ведаў, што гэтая расліна — сапраўдны вораг для нашай прыроды, які выцясняе з прывычнага асяроддзя айчынныя, або, як кажуць, абарыгенныя расліны, што прыжыліся на нашай зямлі шмат стагоддзяў таму.**

— Налічваецца шмат відаў сумніку канадскага. Паўночнаамерыканскія віды актыўна пашыраюць свой арэал на тэрыторыі нашай краіны з канца XX стагоддзя. Яны засяляюць пусткі, абочыны дарог, лясныя паляны, сады, паркі, сухадольныя поймённыя лугі, берагі вадаёмаў. Месцамі ствараюць сапраўдныя зараснікі на значнай плошчы, — расказвае **намеснік старшыні Мінскага абласнога камітэта прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Наталля КУДЫРКА.** — Небяспека распаўсюджвання сумніку заключаецца ў тым, што, займаючы новыя ўчасткі, ён цалкам змяняе навакольную флору і фаўну, прычым распаўсюджваецца вельмі хутка і агрэсіўна. Гэтаму спрыяюць некалькі фактараў. Па-першае, у яго няма так званых натуральных ворагаў з ліку раслін-канкурэнтаў і насякомых. Па-другое, кожны куст дае да 100 тысяч зярнят насення, якое вылучаецца высокай усхожасцю, — да 95 %. Па-трэцяе, з гадамі карэнне сумніку пачынае выдзяляць у глебу ядавітыя рэчывы, якія падаўляюць рост іншых раслін.

Па небяспечнасці для навакольнага асяроддзя сумнік знаходзіцца на адной прыступцы з баршчэўнікам Сасноўскага, а па ступені агрэсіўнасці нават яго перасягае. Ён уключаны ў спіс інвазійных відаў, якія наносяць значныя страты абарыгенным раслінам, навакольнаму асяроддзю, біялагічнай разнастайнасці ў цэлым.

У Мінскай вобласці найбольшыя плошчы, якія займае гэты чужынец, знаходзяцца ў Мінскім раёне — больш за 140 гектараў, Пухавіцкім — 125 гектараў, Смалявіцкім — 93 гектары, Чэрвеньскім — 83 гектары, Лагойскім — амаль 59 гектараў, Валожынскім — 33 гектары, Стаўбцоўскім — каля 29 гектараў, Крупскім — 28 гектараў. Гэта ў суме больш 80 % ад колькасці плошчаў па вобласці, занятых сумнікам. Апошнія гады з абласнога бюджэту выдзяляюцца сродкі для правядзення ў поўным аб'ёме мерапрыемстваў у месцах, дзе «пасяліліся» сумнік і баршчэўнік Сасноўскага. Сёлета на барацьбу з гэтымі інвазійнымі раслінамі плануецца выдаткаваць 420 тысяч рублёў, у тым ліку 300 тысяч — на апрацоўку зараснікаў сумніку. Як правіла, сродкі размяркоўваюцца ў адпаведнасці з займанай імі плошчай у кожным канкрэтным раёне. У некаторых з іх на мерапрыемствы па ліквідацыі гэтых чужынцаў выдзяляюць дадатковыя сродкі землекарыстальнікі і мясцовыя бюджэты.

> Апошнія гады мы адзначаем зніжэнне плошчаў сумніку. Пакуль рана хваліцца нейкімі глабальнымі вынікамі, але зрухі да лепшага ёсць.

Метады барацьбы з сумнікам такія ж, як і з баршчэўнікам Сасноўскага: ручны і механічны, у тым ліку і скошванне, хімічны — з дапамогай гербіцыдаў і камбінаваны. У цяперашні час на Міншчыне ідуць актыўныя работы па ліквідацыі баршчэўніку, бо яго актыўны вегетацыйны перыяд надыходзіць у маі. Асноўныя мерапрыемствы па скарачэнні колькасці сумніку і прафілактыцы яго распаўсюджвання пачнуцца бліжэй да ліпеня.

— Апошнія гады мы адзначаем зніжэнне плошчаў сумніку, — кажа Наталля Кудырка.— Пакуль рана хваліцца нейкімі глабальнымі вынікамі, але зрухі да лепшага ёсць. Мы заўважаем, што вельмі добра ўплывае на змяншэнне колькасці гэтай расліны сітуацыя, калі землі прыцягваюцца пад забудову, у тым ліку катэджную, і прыцягненне ў сельскагаспадарчы і лесагаспадарчы абарот. Тады яна знішчаецца натуральным шляхам, што дазваляе сэканоміць бюджэтныя сродкі.

Працэс распаўсюджвання расліны пакуль можна ўзяць пад кантроль. Гэта агульная задача як спецыялістаў, так і землекарыстальнікаў. Калі ўпусціць момант, то праз некалькі гадоў гэтая работа запатрабуе значна большых намаганняў і сродкаў. Для таго каб зменшыць сельскагаспадарчы ўрон ад сумніку, Мінаблвыканкам штогод зацвярджае комплекс мерапрыемстваў, што, бясспрэчна, дало свае вынікі.

Выкананне мерапрыемстваў знаходзіцца на пастаянным кантролі тэрытарыяльных органаў Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя. Пры правядзенні маніторынгу розных тэрыторый наконт распаўсюджвання інвазійных раслін яны выдаюць землекарыстальнікам рэкамендацыі, устанаўліваюць тэрмін і пералік работ, якія тым трэба правесці. Калі ж пісьмовае патрабаванне не выканана, або выканана не належным чынам, або не ва ўстаноўлены тэрмін, землекарыстальніку пагражае штраф у памеры 20 базавых велічынь.

Вельмі важна, лічыць мая суразмоўніца, што ў Беларусі штогод плануюцца мерапрыемствы па навядзенні парадку на зямлі. Яны фарміруюцца як у цэлым па краіне, так і на ўсіх рэгіянальных узроўнях: і раённым, і абласным. У цэнтральным рэгіёне на працягу некалькіх апошніх гадоў у планы ўключаюцца і заданні па рэгуляванні распаўсюджвання і колькасці сумніку. Гэтае пытанне на вельмі жорсткім кантролі.

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.**

# СПАКОЙ КАЛЯ «РАЙСКАГА САДУ»

## Як райінспекцыя аховы прыроды ратавала і ўладкоўвала гістарычны ўчастак біялагічнага заказніка

**ЦЯПЕР на месцы былога «райскага саду» пануюць летняя цішыня і ўрачыстасць. Непакойчыцы — біялагічны заказнік мясцовага значэння. Тут растуць і квітнеюць паўтары сотні відаў раслін, сярод іх сальвінія плывучая, гваздзік картузіянскі, касач сібірскі. Жывуць тут соня арэшнікавая, чарапаха балотная, махаон. Ёсць і шмат іншых рэдкіх відаў флоры і фауны. У былым садзе памешчыка Райскага, які месцічы даўно празвалі райскім садам, сёлета заліваліся квеценню старыя пакручаныя яблынькі, доўга стаяў трывалы водар квітнеючага бэзу.**

### Гісторыя маёнтка і вандалізм на могілках

Не так і шмат гадоў прайшло з таго часу, як у садзе было зусім не так. Тут зеўралі раскапаныя магільныя скляпенні, ляжалі парушаныя камяні з надпісамі. Мне давялося бачыць гэта на свае вочы і пісаць пра гэта роўна дзесяць гадоў таму. Тады і даведалася пра сумную гісторыю маёнтка паноў Райскіх і пра факт дзікунскага рабавання сямейных могілак.

Фальварак Непакойчыцы згадваецца ў Літоўскай метрыцы ў 1513 годзе. Першыя гаспадары сядзібы, якая ўзведзена ў маляўнічай мясціне на беразе Мухаўца, паходзілі з роду Хадкевічаў. Потым уласнікі мяняліся. Апошнімі сталі Райскія. Яны гаспадарылі на тутэйшых землях амаль чатыры стагоддзі і, як маглі, упрыгожвалі гэтую зямлю. Ёсць звесткі, што ў другой палове XVI стагоддзя ў фальварку ўзвялі пратэстанцкі евангелічны храм, які прастаяў да Другой сусветнай вайны. Пазней, праўда, побач паявіўся і касцёл. Паны пабудавалі таксама бальніцу для сялян, жыллё для работнікаў. У цэнтры сядзібы стаяў прыгожы дом. Стагоддзямі свае фамільныя могілкі Райскія абсталёўвалі ў адпаведнасці са сваёй сістэмай поглядаў і разуменняў. Магіла будавалася ў выглядзе скляпення, а зверху змяшчаўся камень-валун з надпісам. Выглядала гэта велічна і сціпла адначасова. «Спакой яго душы», — высечана на адным з камянёў. Не ведалі гаспадары сядзібы, што ў назве маёнтка закладзены яго лёс... Апошні гаспадар Непакойчыц Эдвард Райскі і яго жонка Ліза разам з дзецьмі выехалі ў Турцыю ў 1939 годзе. Тады і пачалося знішчэнне маёнтка. Касцёл быў разбураны і вывезены на будаўніцтва канюшні ў вёску Пятровічы. Такая ж доля чакала і старажытны евангелічны храм. Сяляне разабралі панскія пакоі аж да падмурка. За кароткі час ад сядзібы фактычна нічога не засталося. І гэта была не рэдкасць па тым часе...

Заставаліся могілкі, якіх адразу не чапалі. Потым усё ж знайшліся вандалы, раскапалі магілы, павыварочвалі труны і раскідалі прах па ваколіцы — нібыта шукалі міфічнае золата. Але ранейшыя апаганьвальшчыкі месцаў пахавання мелі на ўзбраенні толькі рыдлёўкі. Пазней на змену ім прыйшлі больш падрыхтаваныя чорныя капальнікі. У 1992 годзе тут здзейснілася сапраўднае дзікунства. Магілы разварнулі з дапамогай магутнай гусенічнай тэхнікі, могілкі спляжылі ўздоўж і ўпоперак. За наступныя 18 гадоў толькі прырода, як магла, загаіла гэтую рану на зямлі. Ямы крыху паменшалі, насыпы зраўняліся, а былыя могілкі густа зараслі хмызняком і рознымі травамі.

### Суботнік у заказніку

Могілкі месцяцца на ўзвышшы, а побач цячэ рака Мухавец з дзіўным закручастым рэчышчам. З другога боку — адкрытае месца, дзе была панская сядзіба, ад якой засталіся крыху здзічэлыя яблыні. Паводдаль стаяць клёны, ясень, а таксама частка ліпавай алеі, што акаляла сядзібу. Гэта адна з найпрыгажэйшых мясцін Жабінкаўшчыны, яна выдзелена ў заказнік «Непакойчыцы». Менавіта заказнік прычыніўся да пачатку работы па выпраўленні наступстваў дзеянняў вандалаў мінулага стагоддзя. Тагачасны **начальнік раённай інспекцыі прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Сяргей ШТЫК** выпадкова заўважыў знявечаныя могілкі на тэрыторыі заказніка. Ён падняў грамадскасць на добраўпарадкаванне гэтага лапіка зямлі. На першы суботнік прыйшлі работнікі райінспекцыі аховы прыроды, землеўпарадкавальнай службы, Пятровіцкага лясніцтва, іншых устаноў і арганізацый. Наколькі змаглі, людзі ўручную расчысцілі самі могілкі і подступы да іх. Тут жа з'явіліся невялікія стыхійныя звалкі, нелегальныя пясчаныя мінікар'еры — іх ліквідавалі. Далей патрабавалася задзейнічаць тэхніку. За работу ўзялася Жабінкаўская ПМК-10 Брэстаблсельбуда. Будаўнікі не толькі зраўнялі ямы і насыпы, але таксама расчысцілі тэрыторыю, правялі добраўпарадкаванне. Тады давялося размаўляць з **начальнікам ПМК Мікалаем ШПАКОЎСКІМ**, які літаральна загарэўся ідэяй прывесці ў парадак часцінку заказніка.

Мікалай Антонавіч казаў: «Такіх дзівосных па прыгажосці мясцін мала знойдзецца на ўсім Мухаўцы. Тут рэчышча ракі тры разы паварочваецца. А што датычыцца былой сядзібы... Я ледзь не гадзіну хадзіў паміж ліпамі, каб зразумець сістэму, па якой пасаджаны дрэвы, і нарэшце ўцяміў: пасаджаны па тры такім чынам, што кожная тройка ўтварае арку, і тым самым дрэвы загароджваюць пляц ад вятроў. Тут салавей заўжды спявае, белы бэз разросся па ўсёй ваколіцы. Месца сапраўды райскае»...



**На месцы фамільных могілак Райскіх.**

### Завяшчанне Райскіх

Яшчэ Мікалай Шпакоўскі і Сяргей Штык расказвалі, што шукалі ў інтэрнэце інфармацыю пра гісторыю былога маёнтка, але ў сеціве звестак аказалася няшмат. Звярнуліся да гісторыкаў — і атрымалі копіі надзвычай цікавых дакументаў ад мясцовага краязнаўцы Анатоля Бензерука. Адно толькі «Завяшчанне», датаванае 1843 годам, многа кажа пра свайго аўтара, аднаго з гаспадароў Непакойчыц. Станіслаў Райскі на мове пушкінскіх часоў выкладае запаветы дабрыні, спагады, добрасуседства, павагі да зямлі, важнасці навукі для «розуму і сэрца» сваім нашчадкам — дзецям, унукам, праўнукам. Цікава, што ў рускім тэксце часта сустракаецца беларускае словазлучэнне «ласкавы хлеб». Відаць, маецца на ўвазе пенсія, якую гаспадар прызначае многім сваім слугам, а самых здольных з дзяцей чэлядзі прадпісвае аддаваць у навучанне. У «Завяшчанні» Станіслаў распараджаецца заснаваць бальніцу, якая, дарэчы, дастаяла да 1939 года. Там гаворыцца, што «хворых мая жонка будзе дастаўляць сама і мець пра іх клопат». Цэлы раздзел допісу аўтар прысвячае таму, як павінны жыць яго нашчадкі, якімі ідэаламі кіравацца, як пазбягаць дрэнных прыкладаў. У разважанні на тэму адносін з людзьмі Станіслаў спасылаецца на нейкія «Гисторіи предков наших» — відаць, існаваў і такі твор. Нездарма ж у анкеце на пытанне, якімі мовамі свабодна валодае і карыстаецца, аўтар «Завяшчання» пазначыў: руская, польская, французская, нямецкая.

### Выпраўленне памылак

Такія яны былі, Райскія, людзі тутэйшай зямлі, якія ўладкоўвалі і берaглі сваю мясціну. Дваццатае стагоддзе жорстка абышлося з іх родам, і тут ужо нічога не пераменіш. Добра, што знайшліся людзі, якія ўзяліся хоць у нейкай меры выправіць грэх папярэднікаў, што ўчынілі вэрхал на могілках, і тых, хто маўкліва сузіраў кашчунства. Арганізатарам добрай справы, як ужо гаварылася, стаў начальнік раённай аховы прыроды. Праз нейкі час пасля згаданага суботніка і праведзенай работы па добраўпарадкаванні знайшлі спачын косці, якія валяліся на месцы магіл: знойдзеныя астанкі былі перапахаваныя на ранейшых сямейных могілках. Настаяцель Свята-Пакроўскага храма ў Жабінцы Сяргей Петрусевіч адслужыў паніхіду. Айцец Сергій сказаў вельмі важныя словы, якія сталі тлумачэннем таго, што адбылося: «Мы з вамі выправілі памылку перад Богам. Дзякуй усім». Месца пахавання абазначылі.

Важна, што добрая справа знайшла сваіх паслядоўнікаў. Пасля пераходу Сяргея Штыка на работу ў Брэст эстафету падтрымаў яго наступнік, а за ім і цяперашні **начальнік райінспекцыі Аляксандр КУРЫЛОВІЧ**. Да шэфства над заказнікам і канкрэтна над гэтым участкам далучылася **раённая арганізацыя таварыства паляўнічых і рыбаловаў** на чале з **Пятром ВЕРАМКО**. Вось і сёлетняй вясной работнікі гэтых устаноў правялі суботнік, прыбралі смецце, лішнюю расліннасць. Цяпер пра біялагічны заказнік падарожніку расказвае інфармацыйны стэнд, а былыя могілкі абазначаны валуном і адмысловай таблічкай. Для адпачывальнікаў абсталяванае месца з мангалам. Устаноўлены кантэйнер для бытавых адходаў. Цяпер кожны ахвотны можа правесці час ва ўнікальным прыродным кутку, палюбавацца прыгажосцю краявідаў, паслухаць цішыню — і ўсё таму, што знайшліся неraўнадушныя людзі, якія прыклалі рукі і душу да добрай справы. А матэрыялізаванае дабро, як правіла, знаходзіць паслядоўнікаў. Нездарма ж кажуць: калі хочаш палепшыць гэты свет — зрабі лепшай хоць пядзю прасторы вакол сябе.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**

*Жабінкаўскі раён.*


ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ 30 июня 2020 года АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ НЕДВИЖИМОГО ИМУЩЕСТВА, НАХОДЯЩЕГОСЯ В ГОСУДАРСТВЕННОЙ СОБСТВЕННОСТИ

**Продавец и его юридический адрес: открытое акционерное общество «БЕЛФА» г. Жлобин,**
247210, Гомельская область, г. Жлобин, Проезд Красный, 2, тел. (02334) 3-07-60, тел./факс (02334) 2-55-07

| Наименование объекта (лота), местонахождение | № лота | Начальная цена продажи (с НДС), рублей | Сумма задатка, рублей |
|---|---|---|---|
| **Изолированное помещение, инв. № 320/D-29284, площадь 1880,2 кв. м, Гомельская область, г. Жлобин, Проезд Красный, д. 2-2** | 1 | 215 954,52 | 10 797,73 |

**Аукцион состоится 30 июня 2020 г. в 11.00 по адресу: г. Жлобин, Петровского, 45, 2-й подъезд.**

Аукционные торги проводятся в соответствии с Положением о порядке организации и проведения аукционов (конкурсов) по продаже отдельных объектов, находящихся в государственной собственности, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 12 июля 2013 г. № 609.

Организатор торгов – Коммунальное унитарное предприятие по операциям с недвижимым имуществом «Жлобинский центр управления районной коммунальной собственностью», 247210, Гомельская область, г. Жлобин, Петровского, 45, 2-й подъезд, тел./факс: (+375 2334) 9-03-04, 9-03-05.

Лица, желающие участвовать в торгах, обязаны подать организатору торгов в указанный в извещении срок заявление на участие в торгах по форме, утвержденной Государственным комитетом по имуществу, к которому прилагаются:

документ, подтверждающий внесение суммы задатка (задатков) на текущий (расчетный) банковский счет, указанный в извещении, с отметкой банка;

юридическим лицом или индивидуальным предпринимателем Республики Беларусь – копия документа, подтверждающего государственную регистрацию этого юридического лица или индивидуального предпринимателя, без нотариального засвидетельствования;

иностранным юридическим лицом – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны учреждения (выписка должна быть произведена не ранее шести месяцев до подачи заявления на участие в торгах) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны учреждения с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык;

представителем юридического лица Республики Беларусь – доверенность, выданная в установленном законодательством порядке (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель);

представителем гражданина или индивидуального предпринимателя Республики Беларусь – нотариально удостоверенная доверенность;

представителем иностранного юридического лица, иностранного физического лица – доверенность, легализованная в установленном законодательством порядке, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов заявитель (его представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, а руководитель юридического лица – также документ, подтверждающий его полномочия (приказ о назначении на должность руководителя или заверенная выписка из решения общего собрания, правления либо иного органа управления юридического лица в соответствии с учредительными документами, или трудовой договор (контракт), или соответствующий гражданско-правовой договор, или иные документы в соответствии с законодательством).

Документы принимаются по адресу: г. Жлобин, ул. Петровского, 45, **понедельник – четверг с 9.00 до 13.00 и с 13.42 до 17.00, пятница с 9.00 до 13.00 и с 13.42 до 16.00 по 26 июня 2020 г. включительно.** Заявления, поступившие позже установленного срока, не рассматриваются.

*Задаток вносится на расчетный счет КУП «Жлобинский центр управления районной коммунальной собственностью» № BY29AKBB 30120065300133200000 в ОАО «АСБ Беларусбанк», БИК AKBBBY21312, УНН 490317354.*

Задаток победителя торгов (единственного участника торгов) учитывается при окончательных расчетах за предмет торгов по договору его купли-продажи. Задаток, уплаченный участниками аукциона, не ставшими победителем аукциона возвращается в течение 5 (пяти) рабочих дней со дня проведения торгов.

Не допускаются начало торгов и продажа предмета аукциона по начальной цене. Если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником или для участия в нем явился только один участник, предмет аукциона продается этому участнику при его согласии по начальной цене продажи, увеличенной на пять процентов.

Победитель торгов (единственный участник торгов) обязан:

- в течение 10 рабочих дней со дня проведения торгов перечислить на текущий (расчетный) банковский счет, указанный в соответствующем протоколе, сумму затрат на организацию и проведение торгов;
- в течение 10 рабочих дней со дня проведения аукциона произвести оплату затрат за публикацию извещения о проведении аукциона;
- в течение 1 рабочего дня с момента оплаты предоставить Продавцу копии платежных документов по возмещению затрат на организацию и проведение торгов;
- в течение 10 календарных дней с момента подписания протокола аукциона заключить договор купли-продажи;
- в течение 10 календарных дней с момента заключения договора купли-продажи произвести оплату.

Организатор торгов имеет право отказаться от их проведения в любое время, но не позднее чем за три дня до наступления даты проведения аукциона.

В соответствии с действующим законодательством Республики Беларусь может быть предоставлена рассрочка оплаты недвижимого имущества.

**Телефон организатора аукциона (02334) 9 03 04.**

**Телефон продавца для справок (02334) 3 07 98.**

**Адрес сайта:** Государственный комитет по имуществу Республики Беларусь https://gki.gov.by

ОАО «Гомельоблреклама»
филиал «Эксперт-Услуга»
(организатор аукциона) по поручению
ОАО «Жлобинский механический завод «Днепр»
(продавец) в лице ликвидатора
ОАО «Жлобинский механический завод «Днепр» – директора ООО «Модель антикризисного управления» Куценковой Н. С.
извещает о проведении 18 июня 2020 года
открытого повторного аукциона
по продаже имущества
со снижением начальной цены на 70 %
в 11.00 в городе Гомеле по улице Гагарина, 20

| № лота | Наименование предметов торгов | Начальная цена продажи имущества, с учетом НДС (20 %), бел. руб. | Сумма задатка, с учетом НДС (20 %), бел. руб. |
|---|---|---|---|
| **Условие продажи:** победитель (единственный участник) аукционных торгов самостоятельно и за свой счет проводит демонтаж, погрузку, транспортировку приобретенного на аукционе имущества. В случае нарушения целостности имущества Продавца при демонтаже и погрузке приобретенного имущества на Покупателя возлагается обязанность по приведению поврежденного имущества в первоначальное состояние. **Местонахождение лотов:** Гомельская обл., Жлобинский р-н, г. Жлобин, ул. Школьная, д. 8 | | | |
| 8 | Радиально-сверлильный станок 2М55, инв. № 50002 | **1 140,00** | 114,00 |
| 11 | Настольно-сверлильный станок ГС2116К, инв. № 61343 | **1 500,00** | 150,00 |
| 16 | Кругло-шлифовальный станок 3Б12, инв. № 50014 | **690,00** | 69,00 |
| 19 | Установка для воздушно-плазменной резки УВПР-0901, инв. № 60595 | **810,00** | 81,00 |
| 20 | Печь муфельная SNOL 30/1300, инв. № 60701 | **540,00** | 54,00 |
| 21 | Станок 4К722АФ-1, инв. № 50372 | **1 890,00** | 189,00 |
| 22 | Кран-балка электрическая г/п 2 тн, инв. № 50132 | **720,00** | 72,00 |
| 25 | Кран-балка, г/п 1 тн, инв. № 50117 | **510,00** | 51,00 |
| 30 | Стенд для испытаний коллектора центрального 130.00-52.00.9000, инв. № 60943 | **5 010,00** | 501,00 |
| 32 | Котел водогрейный КВ-1, инв. № 60552 | **3 690,00** | 369,00 |
| 33 | Толщиномер Mikrogage II, инв. № 60702 | **420,00** | 42,00 |
| 34 | Системный блок Sempron 2.8 (констр. отдел), инв. № 60678 | **66,00** | 6,60 |
| 47 | Платежный электронный мобильный терминал IWL.220 GPRS, инв. № 61399 | **174,00** | 17,40 |

**Продавец:** Открытое акционерное общество «Жлобинский механический завод «Днепр», 247210, Гомельская область, г. Жлобин, ул. Школьная, 8. Порядок ознакомления с имуществом осуществляется по контактному тел. **8 (029) 303-53-09 – Григорович Павел Карлович. Шаг аукционных торгов –** 5 (пять) % от начальной цены предмета аукциона и не изменяется в течение всего аукциона. **Для участия в аукционе необходимо: 1.** Оплатить задаток на расчетный счет **Организатора торгов (ОАО «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга»):** р/с BY52 BLBB 3012 0400 0712 0400 1001, БИК BLBBBY2X, дирекция ОАО «Белинвестбанк» по Гомельской области, УНП 400071204, назначение платежа – задаток за участие в аукционных торгах **(задаток для участия в аукционе перечисляется до подачи заявления)**; **2.** Подать заявление организатору аукциона по установленной форме с приложением необходимых документов можно **с 5 июня 2020 г.** по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 20, 2-й этаж, каб. «Эксперт-Услуга» в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 16.00. **Прием заявлений для участия в аукционе заканчивается 16 июня 2020 г. в 16.00 включительно. Заявления, поступившие после установленного срока, не принимаются.** Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее чем за три дня до его проведения.

**В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того**, что заявление на участие в нем подано только единственным участником, объект аукциона продается этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на **5 (пять) %**. Участник торгов имеет право до начала торгов письменно отозвать свое заявление на участие. Неявка участника торгов на торги признается отказом от участия в торгах. В этих случаях сумма внесенного им задатка возвращается **Организатором** в течение **5 (пяти) рабочих дней** со дня проведения торгов. Победителями торгов будут признаны участники, предложившие более высокую цену. Лица, являющиеся победителями торгов, обязаны: подписать протокол о результатах аукциона; заключить договор купли-продажи в течение **5 (пяти) календарных дней** от даты подписания протокола о результатах аукциона; оплатить приобретаемое имущество согласно договору купли-продажи в течение **30 (тридцати) рабочих дней** и произвести оплату за услуги (вознаграждение) по организации и проведению торгов в течение **5 (пяти) рабочих дней** с момента подписания протокола. Задатки, уплаченные участниками аукциона, ставшими победителями, будут учтены в счет исполнения обязательств по договору купли-продажи. Проводится аукцион в соответствии с «Положением о порядке продажи имущества ликвидируемого юридического лица с публичных торгов», утвержденное постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.01.2013 № 16 (в ред. постановления Совмина от 12.07.2013 № 607). Ранее опубликованное извещение о торгах размещено в газете «Звязда» от **27.09.2019 г. № 184 (29051)**. **Порядок оформления участия в аукционе, в том числе документации, необходимой для регистрации участника торгов, порядок проведения аукциона размещены на официальном сайте Организатора торгов – www.expert-usluga.by, раздел «Аукционы».**

**Дополнительная информация по контактным телефонам Организатора аукциона: 8 (0232) 23-23-54 (тел./факс), 23-23-56, 8 (029) 126-66-62.**

ТРАНСГРАНІЧНЫЯ ПРАЕКТЫ

# ПРЫЦЯГНЕННЕ ЮБІЛЕЙНАГА

## На беразе гэтага возера, што пад Гроднам, з'явілася атмасферная ратонда

**ДНЯМІ яе зманціравалі будаўнікі якраз да пачатку купальнага сезона. Новы архітэктурны аб'ект уваходзіць у лік, рэалізаваных па праграме трангранічнага супрацоўніцтва з польскім бокам згодна з праектам «Шляхам Тызенгаўза».**



Як паведаміў яго каардынатар **дэпутат Гродзенскага гарадскога Савета дэпутатаў Сяргей КАЛЯДА**, новы трансгранічны веласіпедны маршрут мае працягласць 59 кіламетраў і яднае беларускі горад Гродна і польскі — Сакулку. Завяршыць яго рэалізацыю плануецца ў хуткім часе.

Што ён сабой уяўляе? Распачынаецца велашлях на плошчы Тызенгаўза ў Гродне ў турыстычным цэнтры і пралягае праз вуліцы Савецкую і Суворава абласнога цэнтра ў напрамку возера Юбілейнае. Гэта адно з самых папулярных месцаў адпачынку гараджан у летні перыяд, таму, вядома, уладкаванне новых пунктаў прыцягнення на ім — адна з прыярытэтных задач гарадскіх улад.

Дзякуючы рэалізацыі трансгранічнага веламаршруту «Шляхам Тызенгаўза» тут з'явілася не толькі атмасферная ратонда, з якой адкрываюцца найлепшыя краявіды гэтых мясцін, але і стаянка для велатурыстаў, лаўкі для адпачынку і іншыя зручнасці для велааматараў. Таксама тут месціцца інфармацыйны стэнд з картай маршруту.

Згодна з ім, далей трэба рухацца ў напрамку вёскі Каробчыцы ў бок беларуска-польскай граніцы па асфальтавай шашы.

Трэба сказаць, што маршрут праходзіць як па спецыяльна зробленых велассцежках, так і па існуючых элементах дарожнай сеткі. Між іншым, 33 з 59 кіламетраў велашляху знаходзіцца на беларускай тэрыторыі. Дзяржаўную граніцу велатурысты перасякаюць у пагранічным пункце пропуску «Брузгі-Кузніца» і едуць у напрамку турыстычнага комплексу «Багульнікі», завяршаючы свой маршрут у Сакулцы.

Па словах Сяргея Каляды, з рэалізацыяй гэтага праекта планы па наданні возеру Юбілейнае большай прывабнасці сярод гродзенцаў і гасцей абласнога цэнтра не заканчваюцца. Ёсць ідэі наконт з'яўлення тут спартыўнай пляцоўкі і нават будаўніцтва фантана, але іх рэалізацыя яшчэ наперадзе. Можа, у іншым трансгранічным праекце?

**Вольга АНУФРЫЕВА.**

ЛІЧБЫ І ФАКТЫ

# Талакой супраць «агрэсіўнай флоры»

**НА Віцебшчыне большая, чым у іншых абласцях, агульная плошча, занятая баршчэўнікам. Летась на мерапрыемствы па рэгуляванні распаўсюджвання прадстаўніка «агрэсіўнай флоры» з бюджэтаў розных узроўняў накіравалі 660 тысяч рублёў, а землекарыстальнікамі — яшчэ 426 тысяч.**

Як паведамілі ў Віцебскім абласным камітэце прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя, работы праведзены на плошчы 2282 гектары, у тым ліку механічным метадам — 172 гектары, хімічным — 1952, камбінаваным — 158 гектараў. Найбольш эфектыўным метадам барацьбы з баршчэўнікам Сасноўскага з'яўляецца хімічны — з выкарыстаннем спецыяльных хімічных рэчываў (гербіцыдаў), якія выклікаюць гібель раслін. Сёлета такім чынам плануецца апрацаваць больш за 70 % (2794 гектары) плошчаў, занятых шкоднай раслінай.

Цікава, што ў Чашніцкім раёне ў выніку штогадовага правядзення работ на ўсіх раней займаемых тэрыторыях баршчэўнік Сасноўскага знішчаны. На кантролі знаходзіцца дванаццаць участкаў. Эколагі лічаць, што гэта доказ актыўнага ўдзелу мясцовай улады з комплексным падыходам.

Паводле інфармацыі на пачатак года, устаноўлена 4027 месцаў знаходжання баршчэўніку Сасноўскага агульнай плошчай 3947,41 гектара. Самымі інвазіўнымі раёнамі з'яўляюцца Ушацкі — 1164 месцы вырастання агульнай плошчай 1426,13 гектара; Віцебскі — 399 месцаў агульнай плошчай каля 772 гектараў; Гарадоцкі (адпаведна 526 і 411).

Сёлета з мясцовых бюджэтаў на знішчэнне расліны прадугледжана выдаткаваць каля 551,5 тысячы рублёў.

Між іншым, за нясвоечасовае выкананне работ могуць пакараць. Напрыклад, летась да адміністрацыйнай адказнасці прыцягнулі 124 землекарыстальнікаў, накладзена штрафаў на суму 17,6 тысячы рублёў.

**Старшыня Віцебскага аблвыканкама Мікалай ШАРСНЁЎ** лічыць, што трэба паскорыць працэс знішчэння баршчэўніку, і ўпэўнены, што кіраўнікі выканаўчай улады ў глыбінцы павінны асабіста адсочваць, ці робіцца ўсё магчымае і ці своечасова гэта адбываецца.

Штогод з розных крыніц выдаткоўваюцца немалыя фінансавыя сродкі, таму неабходны больш эфектыўныя вынікі барацьбы, выказаў думку губернатар, калі адпаведная тэма абмяркоўвалася ў аблвыканкаме.

**Старшыня Віцебскага абласнога Савета дэпутатаў Уладзімір ЦЯРЭНЦЬЕЎ** падчас абмеркавання з калегамі пытання добраўпарадкавання папрасіў вывучаць вопыт тых, каму ўдалося дасягнуць станоўчых вынікаў. Акрамя ўсяго іншага трэба не забывацца пра тлумачальную работу ў глыбінцы, каб не было выпадкаў траўматызму ў выніку непрафесійнага знішчэння небяспечнай расліны.


Знішчэнне баршчэўніку ва Ушацкім раёне.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**
**Фота дадзена Віцебскім абласным камітэтам прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя.**

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ
ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРНЫХ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ № 15 ад 17 лютага 2009 года выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
**Заснавальнікі:** Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

**Выдавец — рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»**

**Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.**

**Адказны за выпуск: АНУФРЫЕВА В. А.**

www.zviazda.by

e-mail: info@zviazda.by

(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

АДРАС РЭДАКЦЫІ:
220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.

**КАНТАКТНЫ ТЭЛЕФОН** 287 18 31;
**e-mail:** info@zviazda.by

**Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 03.04.2009. 220013, г. Мінск, прасп. Незалежнасці, 79/1.**

**Тыраж 14.804.** **Нумар падпісаны ў 19.30 4 чэрвеня 2020 года.**